

ТОНКАСЦІ НОВАГА ПАДАТКОВАГА ПАРАДКУ **6**

ШТО Ў ТРЭНДАХ НА ПЛАНЕЦЕ **12**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 СТУДЗЕНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 15 (29895)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 студзеня падпісаў указ нумар 19 «Аб звальненні ў запас і прызыве на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве».**

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ нумар 16, які пашырае інструменты фінансавай падтрымкі экспарту.

• **Сярэдні заробак у Беларусі ў снежні склаў Br1915,6.**

• Шырокае прымяненне айчыннай вакцыны ад COVID-19 плануецца пачаць у Беларусі ў 2024 годзе.

• **Еўразійскі эканамічны форум з удзелам кіраўнікоў дзяржаў ЕАЭС плануецца правесці 24—25 мая.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«Прыватным цэнтрам для прадаўжэння работы трэба строга выконваць ліцэнзійныя патрабаванні: адпавядай ліцэнзійным патрабаванням і працуй. На дадзены момант прыпынена дзейнасць невялікай колькасці прыватных цэнтраў, да таго ж яны цяпер рыхтуюцца да адкрыцця. Патрабаванні да якасці аказання медыцынскай дапамогі прад'яўляюцца да ўсіх устаноў аховы здароўя, у тым ліку гэта датычыцца і камерцыйных арганізацый. Аб'ём можа адрозніваацца, але якасць аказання медапамогі не павінна адрознівацца ад сельскага населенага пункта да сталіцы».*

З першых вуснаў

# «ТЫЯ, ХТО ГАТОВЫ ЖЫЦЬ У МІРЫ, СТВАРАЦЬ ДЗЕЛЯ ДАБРАБЫТУ СВАЁЙ КРАІНЫ, НЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДКІНУТЫ ГРАМАДСТВАМ»

**Грамадска-палітычную абстаноўку абмеркавалі на нарадзе ў Прэзідэнта. Удзельнікі нарады дэталёва разгледзелі комплекс пытанняў, якія маюць вялікае значэнне для жыцця краіны. Цэнтральнай тэмай стала абарона законных правоў і інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь.**



Фота БелТА.

«Мы мала ўвагі звяртаем на гэтую праблему, але яна існуе. Няхай у параўнанні з іншымі дзяржавамі, нават самымі дэмакратычнымі ў свеце, гэта кропля ў моры. Але, тым не менш, аб гэтым нельга забываць», — акрэсліў галоўнае пытанне нарады кіраўнік дзяржавы.

### Крок насустрач для тых, хто раскаяўся

З гэтага вынікае яшчэ адно, актуальнае для краіны пытанне: як быць з тымі, хто яшчэ ўчора выступаў супраць дзяржавы. Пасля 2020 года хтосьці пакінуў краіну, хтосьці знаходзіцца ў месцах не такіх далёкіх. А некаторыя раскаяліся і сёння хочуць вярнуцца, але баяцца. Некаторыя звярталіся да Прэзідэнта з просьбай аб памілаванні.

«Я адчуваю, што і ў грамадстве, і ў асобнай часткі грамадства з'явіўся запыт на дадзеную тэму. Таму я даручаў Адміністрацыі Прэзідэнта з удзелам грамадскасці прапрацаваць гэтае пытанне і прапанаваць механізм яго вырашэння», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён растлумачыў, чаму было даручана прыцягнуць да гэтай работы і грамадскасць: «Я выконваю свае абавязкі паводле Канстытуцыі нашай краіны. Як кіраваў краінай, так і кірую. Што да сілавікоў. Яны сваю ролю ў 2020 годзе адыгралі. Яны тады мяне не падвялі ў цэлым. Яны выканалі дакладна пастаўленыя перад імі задачы. Яны ведаюць, я таксама ведаю, што адбывалася і як мы супрацьстаялі гэтаму працэсу кожную хвіліну, кожную секунду я быў у тэме і аддаваў адпаведныя распараджэнні. Славыя падраздзяленні не адступілі і нідзе, па вялікім рахунку, не правалілся. Вядома, я сёння ўлічваю іх меркаванне. Для мяне вельмі важнае меркаванне хлопцаў, якія служаць у спецпадраздзяленнях. Ваенныя людзі, якіх мы прыцягвалі для таго, каб навесці парадак. Унутраныя войскі тут сталі насмерць. Вядома, я іх бязмерна паважаю, аддаю належнае і ўлічваю іх меркаванне».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што лёс ваенных людзей, дзяржаўных служачых, чыноўнікаў, з аднаго боку, — жорстка рэагаваць, абараняць краіну і правапарадак і ў той жа час зыходзіць не з асабістых, а з дзяржаўных інтарэсаў, недзе адступіць, зрабіць крок насустрач, калі гэта трэба. Ён нагадаў, што ў храме на Раство казаў аб тым, што не трэба ствараць дадатковыя пункты напружання ў грамадстве. Таму і было дадзена даручэнне адпрацаваць магчымы механізм вырашэння пытання з вяртаннем на Радзіму людзей, якія з'ехалі пасля падзей 2020 года.

***«Тыя, хто гатовы жыць у міры, ствараць дзеля дабрабыту сваёй краіны, не павінны быць адкінуты грамадствам. Гэта аксіёма. Гэта не я прыдумаў. Калі мы людзі мудрыя і ўлада мае прыкметы мудрасці, яна павінна ў такім рэчышчы і дзейнічаць. Нам трэба не закрывацца ад тых, хто спатыкнуўся і зразумеў гэта, а зрабіць крок насустрач.*** Але толькі тым, хто вернецца з месцаў не вельмі аддаленых ці з-за мяжы і будзе, як у нас прынята казаць, «ябацькам» яшчэ большым, чым тыя, хто сёння нас атачае. А такія ёсць», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што ворагі ўсяляк будуць перашкаджаць вяртанню дадому гэтых людзей. Па яго словах, для збеглых, якія гандлююць інтарэсамі народа, простыя людзі заўсёды будуць таранам для барацьбы супраць дзяржавы і пастаяннай крыніцай асабістага фінансавага дабрабыту. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, як «захлынуліся» некаторыя СМІ і тэлеграм-каналы, калі ён заявіў, што ўлады гатовыя размаўляць з тымі, хто ўсвядоміў сваю віну і гатовы жыць на Радзіме: «Ах, тут хапаюць сілавікі тых, хто паспрабаваў прыехаць, садзяць ці ледзь не забіваюць!» Абсалютная лухта. Ніхто нікога не хапае. Але чаму яны так сябе паводзяць? Таму што калі ім — «ціхушкам», «лахушкам», — грошы і даюць, то толькі ўлічваючы, што ў іх там пара тысяч людзей, якія беглі разам з імі. І Захад выдатна разумее, што гэтых людзей у перспектыве можна выкарыстаць супраць нашай краіны. Як мы дакладна ведаем, да гэтых няшчасных паўтары тысячы даходзяць, можа быць, цэнт-два. Усё астатняе асядае ў кішэнях у штабах, офісах».

СТАР. 2

Навука

# АД ІДЭІ ДА БІЗНЕСУ

## Як інавацыйныя распрацоўкі Купалаўскага ўніверсітэта ўкараняюцца ў рэальны сектар эканомікі



**ГрДУ імя Янкі Купалы — цэнтр навукі і інавацый Гродзенскага рэгіёна. Ён валодае сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базай, на аснове якой выконваюцца як фундаментальныя, так і прыкладныя даследаванні па шырокім спектры кірункаў. А ўздел у эксперыментальным праекце па ўкараненні канцэпцыі «Універсітэт 3.0» якраз і скіраваны на прадпрымальніцтва. Гэта прадугледжвае і стратэгія інавацыйнай дзейнасці, якая распрацавана ва ўніверсітэце да 2030 года.**

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X
23015
9 771990 763008

# «ТЫЯ, ХТО ГАТОВЫ ЖЫЦЬ У МІРЫ, СТВАРАЦЬ ДЗЕЛЯ ДАБРАБЫТУ СВАЁЙ КРАІНЫ, НЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДКІНУТЫ ГРАМАДСТВАМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## «Агулам ніхто нічога рабіць не павінен»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што кожны, хто стаў на шлях выпраўлення і хоча загладзіць сваю віну, павінен мець шанц на разуменне і паблажку. Але гэта датычыцца толькі тых, хто рэальна заслугоўвае даравання. А тыя, хто свядома пераступіў рысу закона, паставіў пад пагрозу чалавечыя жыцці, пры падтрымцы заходніх спецслужбаў працягвае дэструктыўную дзейнасць супраць нашай краіны, будуць адказваць перад законам. Прэзідэнт звярнуў увагу, што закон прывялі ў адпаведнасць і зрабілі больш жорсткім. ***«Тым больш што асобныя з тых, хто ўцёк (есці ж хочацца), узмацнілі пазіцыю і цяпер стаўку робяць на прымяненне сілы і стварэнне незаконных ваенізаваных фарміраванняў. У такім выпадку дарогі назад няма і не будзе»,*** — папярэдзіў ён. Як прыклад кіраўнік дзяржавы прывёў «каліноўцаў» ва Украіне і харугвы, якія фарміруюцца ў Літве і Польшчы. Па яго словах, цудоўна відаць, што афіцыйныя ўлады спрабуюць ад іх дыстанцыявацца. «Іх на фронт адпраўляюць: ідзіце на фронт, трэніруйцеся. Натрэніруецеся — паедзеце ў Беларусь скідаць уладу. Зладзіце там шабаш, вайнушку... Нядаўна на фронце трапілі пад абстрэл. Нямала загінула, але калекамі колькі засталося. Каму яны сёння патрэбныя? Нікому», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён зрабіў акцэнт на тым, што чакае вялікая работа, каб ва ўсім разабрацца.

«Яшчэ раз падкрэсліваю: агулам ніхто нічога не павінен рабіць. Бо мы страцім сваіх прыхільнікаў, і законна страцім. Мы гэта павінны ўлічваць», — адзначыў Прэзідэнт. Па яго словах, тыя, хто ўсвядоміў свае дзеянні і раскаяўся, павінны публічна зрабіць адпаведную заяву. «Ты пасціўся там у інтэрнэце — расказвай, навошта гэта рабіў, і кайся перад народам. А потым разам з людзьмі, з грамадскасцю, з журналістамі, з блогерамі, хто быў на перадавой тады, мы будзем вырашаць, што з імі рабіць. Але крок насустрач трэба рабіць. ***Трэба дакладна вызначыць, хто сапраўды перагледзеў свае погляды і хоча спакойна жыць, вучыцца і працаваць. А хто — не»,*** — упэўнены беларускі лідар. Але, па яго словах, не выключана, што некаторыя могуць скарыстацца крокамі насустрач, каб нанесці пэўную шкоду, у тым ліку ў інтарэсах спецслужбаў замежных дзяржаў, асабліва суседзяў на захадзе і поўдні.

***«Таму наша задача — індывідуальны падыход да кожнага і справядлівасць у прыняцці рашэнняў»,*** — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «Нам трэба згуртавацца, каб выжыць»

Прэзідэнт падкрэсліў, што некаторыя сцішыліся, некаторыя яшчэ сябе праяўляюць. І над гэтым вядзецца вялікая работа. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што, калі б у 2020 годзе беларусы не выстаялі, сёння б у нашай краіне было горш, чым ва Украіне. «Дрэнна, што ў нас так складваецца сітуацыя вакол краіны. Асабліва з нашай Украінай. Але гэта ж для нас урок. Для ўсіх дзесяці мільёнаў і гасцей, якія ў нас тут бываюць, гэта ўрок», — сказаў Прэзідэнт. Я не хачу, каб мне ці вам кланяліся за гэта і нам дзякавалі, але ўсім зразумела, у імя чаго і дзякуючы каму выстаялі. І калі ўжо пасля гэтага хтосьці вылазіць з-пад плінтуса, як таракан, і пачынае ізноў або працягвае гэтую сваю брыдкую справу, ваюючы супраць народа і супраць улады... Калі хтосьці, не дай бог... Але адкрыта зараз пабойваюцца некаторыя. Слухайце, як з імі сёння паступаць?» — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ніколі не будуць дапушчаны хістанні, як у 2020 годзе. Ён заўважыў, што тады і пандэмія, і перадвыбарныя і выбарныя пытанні паўплывалі, але гэта не апраўданні. ***«Нам трэба згуртавацца, каб выжыць. Каб, не дай бог, тут неляталі ракеты і не кідалі ў нас бомбы.*** Яны там ужо на Захадзе рукі паціраюць, ва Украіне гэтых рыхтуюць, не ведаю, навошта ўкраінцам. З аднаго боку, просяць, каб мы ні ў якім разе не ваявалі з Украінай, каб нашы войскі туды не рухаліся, пакт аб ненападзе прапануюць заключыць. А з іншага боку, рыхтуюць гэтую грымучую сумесь і ўзбройваюць іх. Польшча, Літва ўвогуле ачумелі. Нашто ім гэта трэба, незразумела. Мы вымушаны жорстка рэагаваць», — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, беларусам па перыметры хапае пытанняў, на граніцы хапае праблем. І спачатку трэба вырашыць іх. ***«Таму рэакцыя на гэтую ўнутраную не апазіцыю, а экстрэмістаў, якія вылезлі з-пад плінтуса ці не вылезлі, будзе жорсткая. І няхай не крыўдзяцца, мы папярэджваем»,*** — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

## «У нашай краіне ёсць будучыня і перспектыва»

Прэзідэнт таксама звярнуўся да некаторых практычных пытанняў, якія не церпяць адтэрміноўкі. Адно з іх — выстаўка навукова-тэхнічных дасягненняў «Беларусь інтэлектуальная». Па словах кіраўніка дзяржавы, нікуды не варта, што яе праводзілі толькі тры дні. Выстаўка выклікала вялікую зацікаўленасць у людзей, патокам ішлі просьбы падоўжыць яе работу, што і было зроблена па даручэнні Прэзідэнта. Ён зрабіў акцэнт на тым, што праз гэтую выстаўку трэба правесці моладзь. «Яны ж тыцкаюць у гэтыя смартфоны і ўпэўнены, што ў нас у краіне нічога не робіцца на перспектыву. Але тыя, хто там пабыў, ахаюць і вохкаюць: няўжо мы гэта зрабілі», — адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама падкрэсліў, што не трэба трымаць выстаўку толькі ў Мінску. Яе неабходна прадставіць у абласных цэнтрах і буйных гарадах, паколькі ў рэгіёнаў таксама ёсць вялікая цікавасць. «Няхай людзі паглядзяць, што робяць нашы вучоныя і што ў нашай краіне ёсць будучыня і перспектыва», — адзначыў беларускі лідар.

## «За суткі можна навесці парадак на дарогах»

Аляксандр Лукашэнка ўзняў яшчэ адну надзённую тэму. Апошнім часам на імя Прэзідэнта паступае шмат скаргаў на стан дарог. Людзі скардзяцца на дарогі ў Мінску, але гэтая тэма актуальная для ўсіх. Зразумела, уплываюць і кліматычныя ўмовы, але ёсць і іншыя фактары, з якімі могуць разабрацца адказныя асобы. «Людзі павінны разумець, што зіма ў нас увогуле агідная: то мароз мінус 20—25, потым дождж пайшоў, то зноў пачне падмарожваць. Натуральна, наш асфальт пачынае крышыцца. Ясна, што недзе «накасячылі» дарожнікі і гэтак далей... Але гэта не апраўдвае і таго, што ў нас у Мінску», — сказаў кіраўнік дзяржавы. У панядзелак па яго даручэнні служба бяспекі і міліцыя праехалі па ўсіх дарогах і ацанілі іх стан. Выснова: дарогі на «тройку». За суткі людзі зрабілі выснову: цярпіма, але працаваць трэба. Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай і міністру ўнутраных спраў Івану Кубракову разабрацца з праблемай і прывесці ў парадак дарогі. Па яго словах, у Мінску паўсотні машын, нават больш, якія ў гэты перыяд павінны працаваць з ямачным рамонтам. «За суткі, калі арганізаваць дастойна, можна навесці парадак на дарогах. Калі ласка, разам разбярыцеся з Кухаравым (Уладзімірам Кухаравым, старшынёй Мінгарвыканкама. — **«Зв.»**) і гарвыканкамам. Будзе дрэнна, калі пачну разбірацца я», — адзначыў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што дарогамі і ўсім, што з імі звязана, трэба займацца не толькі ў Мінску і буйных гарадах, а ўсюды.

## «Усе павінны плаціць падаткі»

Яшчэ адным актуальным пытаннем для краіны Прэзідэнт назваў сітуацыю з індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія з новага года будуць працаваць па новых правілах. Але не ўсе зразумелі, у чым сутнасць новаўвядзенняў і як змяніліся ўмовы працы. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы даручыў чыноўнікам паразмаўляць з прадпрымальнікамі і яшчэ раз усё падрабязна растлумачыць. Ён падкрэсліў, што змены для ІП былі аб'яўлены загадзя і быў час да іх падрыхтавацца. «Трэба цывілізавана працаваць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, надышоў час, калі ў рабоце ІП наспелі змены. Таму было прынята рашэнне, што ІП павінны ўзняцца на ўзровень вышэйшы і, як усе фізічныя або юрыдычныя асобы, плаціць падатак. Пры гэтым застаецца такая катэгорыя, як рамеснікі — людзі, якія робяць сваімі рукамі нешта выключнае. Па словах Прэзідэнта, яны маюць права прадаваць свае тавары па той цане, па якой змогуць прадаць. «А ўсе астатнія павінны плаціць падаткі як належыць», — сказаў беларускі лідар. Пры гэтым, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, нікога не пакрыўдзяць. «Тое, што ты зарабіў на сёння, у цябе ніхто не адбярэ, калі, вядома, не парушаў закон», — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы падсумаваў, што кожную праблему трэба вывучаць у адпаведным органе ўлады і на яе рэагаваць, паколькі людзі жывуць гэтымі пытаннямі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У тэму

## Кожнаму будзе дадзены шанц вярнуцца дадому

Пасля нарады ў Прэзідэнта генеральны пракурор Андрэй Швед у размове з журналістамі адзначыў, што ў Беларусі абсалютна спакойнае становішча. Ён запэўніў, што праваахоўны блок і далей будзе рабіць усё неабходнае, каб гарантаваць грамадскую бяспеку. А тыя, хто зробіць замах на канстытуцыйны лад нашай краіны, па словах генеральнага пракурора, паўстануць перад законам, панясуць адказнасць. У дадзеным пытанні пазіцыя нязменная.

«Прынята прынцыповае рашэнне: будзе створана міжведамасная камісія, якую ўзначаліць генеральны пракурор. У склад гэтай камісіі будуць уключаны прадстаўнікі грамадскасці, дэпутацкага корпуса, службовыя асобы дзяржаўных органаў. Тыя, хто знаходзіцца за мяжой, жадае вярнуцца на Радзіму, але чагосьці баіцца, будуць мець магчымасць звярнуцца (інфармацыю размесцяць ва ўсіх сродках масавай інфармацыі) у камісію і атрымаць адпаведныя тлумачэнні — аб магчымасці вярнуцца, аб наяўнасці або адсутнасці нейкіх прэтэнзій з боку дзяржаўных органаў да гэтай канкрэтнай асобы», — расказаў Андрэй Швед. Ён падкрэсліў, што пры гэтым работа будзе весціся не агулам, а з кожным грамадзянінам індывідуальна. Чакаецца, што міжведамасная камісія пачне працаваць у найбліжэйшы час: распрацоўваецца адпаведны праект прэзідэнцкага ўказа. Кіраўнік дзяржавы даручыў падрыхтаваць дакумент у найкарацейшыя тэрміны. Андрэй Швед падкрэсліў, што асноўнае патрабаванне Прэзідэнта — даць людзям шанц.

«Многія ж сапраўды ні ў чым не абвінавачваюцца, не падазраюцца. Але ім так, вобразна кажучы, прамылі мазгі, што яны самі сабе нешта выдумалі. Таму нават у першую чаргу яны павінны да нас звярнуцца, і мы гэтаму чалавеку павінны сказаць: да вас няма прэтэнзій, можаце спакойна вярнуцца ў краіну і жыць спакойным жыццём. Гэта адна катэгорыя асоб. Іншая катэгорыя — якія самі выразна ведаюць або сумняваюцца, адчуваюць, што нешта ёсць. Мы тады перапраўляем усю інфармацыю і кажам: вы здзейснілі такія вось злачынствы або падазраваецеся, абвінавачваецеся, ёсць такія прававыя механізмы. У выпадку раскаяння, напрыклад, вярнуцца праз памілаванне, іншыя спосабы. Усё ў рамках закона», — растлумачыў генеральны пракурор. Па яго словах, станоўчыя рашэнні будуць прымацца адносна тых асоб, якія не ўчынялі злачынстваў, не замахваліся на канстытуцыйны лад, якія раскаяліся і сапраўды хочуць вярнуцца і жыць мірным ды спакойным жыццём у нашай краіне. «І нават у адносінах да тых, хто ўчыніў злачынствы, мы з пункту гледжання закона ў індывідуальным парадку будзем прымаць рашэнні ў дачыненні да тых, хто раскаяўся (у нас дастаткова прававых механізмаў). Гэта значыць, кожнаму будзе дадзены шанц вярнуцца дадому і жыць мірна і спакойна, як у любой іншай прававой дзяржаве», — дадаў Андрэй Швед.

### Парламенцкі дзённік

## Тэмп — захаваць, а лепш — павялічыць

**На першым сёлета пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў парламентарыі абмеркавалі далейшую заканадаўчую дзейнасць у развіццё абноўленай Канстытуцыі і вызначылі прыярытэтныя кірункі работы на найбліжэйшую перспектыву.**

У першую чаргу, як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,** гэта канстытуцыйнае рэфармаванне. «Неабходна завяршыць прыняцце законапраектаў, звязаных з абноўленай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў ён. — На сённяшні дзень з 90 законаў, якія прадугледжаны планам мерапрыемстваў па прывядзенні законаў у адпаведнасць са змяненнямі і дапаўненнямі Канстытуцыі, у 28 мы ўжо неабходныя папраўкі ўнеслі».

У першым чытанні прынята 16 законапраектаў, што карэкціруюць 26 законаў. Яшчэ тры праекты законаў падрыхтаваны да разгляду ў першым чытанні. Галоўная задача, якую паставіў перад усімі камісіямі спікер ніжняй палаты парламента, — у найбліжэйшы час завяршыць работу, звязаную з прыняццем абноўленай Канстытуцыі.

Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу на тое, што патэнцыял па пытаннях заканадаўчай ініцыятывы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў выкарыстоўваецца не цалкам. «За мінулы год у гэтым плане папрацавалі нядрэнна: шэсць законапраектаў, якія былі ініцыіраваны дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, — вельмі добры паказчык, — перакананы спікер ніжняй палаты парламента. — Будзем казаць, гэта практычна самы высокі паказчык за ўсе апошнія гады работы Палаты прадстаўнікоў. Хацелася б, каб і сёлета мы наблізіліся хоць бы да такой лічбы».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што ўказам Прэзідэнта Беларусі зацверджаны план падрыхтоўкі праектаў заканадаўчых актаў на 2023 год. «І я традыцыйна аб тым кажу, каб усе дэпутаты цяпер актыўна падключыліся да распрацоўкі гэтых законапраектаў, уносілі свае заканадаўчыя прапановы і адстойвалі іх на ўсіх узроўнях», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка.

Ён нагадаў, што бягучы год з'яўляецца заключным у рабоце Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання. «І, вядома, адным з галоўных кірункаў нашай работы з'яўляецца заканадаўчая дзейнасць, — акцэнтаваў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У цэлым, усе камісіі добра папрацавалі за мінулы год. Намі было прынята 59 законапраектаў у першым чытанні і 90 — у другім. Работа праведзена вялікая. Я б папрасіў, каб гэты тэмп, які мы набралі, асабліва ў другім паўгоддзі мінулага года, захавалі і сёлета».

Цяпер у пастаянных камісіях знаходзіцца 26 законапраектаў. «21 законапраект варта разгледзець у другім чытанні, — звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка. — Практычна гэта 80 % ад законапраектаў, якія трэба разгледзець у другім чытанні».

Найбольш рэзанасныя з іх — «Аб Усебеларускім народным сходзе», «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», «Аб змяненні Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь» і «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў» — будуць разгледжаны дэпутатамі ўжо сёння.

**Паводле БелТА.**

# АД ІДЭІ ДА БІЗНЕСУ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Яе называюць стратэгіяй апераджальнага развіцця. Згодна з ёю, вышэйшая навучальная ўстанова выбрала не працэсавы, а праектны падыход, рэалізоўваючы, у першую чаргу, праекты ў рамках канцэпцыі «Інавацыйна-ўспрымальны ўніверсітэт».

У значнай ступені гэтаму садзейнічае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Вучэбна-навукова-вытворчы цэнтр «Тэхналаб», якое атрымала статус тэхнапарка. Сёння Цэнтр трансферу тэхналогій універсітэта з'яўляецца мосцікам паміж ВНУ і вытворчымі прадпрыемствамі, распрацоўкамі і іх укараненнем.

У сярэдзіне студзеня на базе тэхнапарка з'явіліся яшчэ два новыя інавацыйныя прадпрыемствы, якія сталі яго рэзідэнтамі. Дарэчы, трэцяя частка рэзідэнтаў — студэнты, выпускнікі альбо выкладчыкі Купалаўскага ўніверсітэта. Цікавыя ідэі заўсёды знаходзяць дапамогу з боку кіраўніцтва ВНУ. У 2019 годзе створаны фонд інавацыйнага развіцця для падтрымкі прадпрымальніцтва. Фонд фінансуе работы студэнтаў і выкладчыкаў па стварэнні прадукту для яго далейшай камерцыялізацыі. Навука павінна прыносіць даход. Такі прынцып, дарэчы, з'яўляецца адным з кірунках стратэгіі інавацыйнай дзейнасці на найбліжэйшыя сем гадоў. Менавіта такі падыход павінен забяспечыць універсітэту ўстойлівае развіццё, лічаць у ВНУ. Гаспадарча-дагаворная дзейнасць у тым ліку разлічана і на работу з замежнымі заказчыкамі. Напрыклад, праект у нафтагазавай сферы распрацаваны для расійскіх партнёраў, навуковае абсталяванне — для ўніверсітэта Казахстана.

Адукацыя — навука — вытворчасць: менавіта такі ланцужок прадугледжвае эксперыментальны праект Мінадукацыі «Універсітэт 3:0». А тэхнапарк стварае поўную інфраструктуру для развіцця інавацыйнага прадпрымальніцтва, дапамагае навукоўцам даводзіць іх прадукт да прадпрыемстваў. Тут размешчана высокатэхналагічнае абсталяванне, якое даецца ў арэнду рэзідэнтам парка па аказанні паслуг у 3D-мадэляванні, 3D-прататыпіраванні, лазернай рэзцы, інфармацыйных паслуг і іншых.

Але не толькі. Тут могуць аказаць неабходную кансультацыйную дапамогу ў ажыццяўленні распрацовак.

— Пры Цэнтры трансферу тэхналогій універсітэта створана студыя праектаў і стартапаў, дзе студэнтаў навучаюць інавацыйнаму прадпрымальніцтву на гадавых курсах. Як правіла, многія прыходзяць са сваімі праектамі, якія ў далейшым удзельнічаюць у конкурсе «ІнНаСтарт», дзе кожны год прапаноўваецца да 70-80 інавацыйных студэнцкіх праектаў, — расказаў **прарэктар па навуковай рабоце ГрДУ імя Янкі Купалы Андрэй ПРАНЕВІЧ.**

Якія гэта праекты? Аказалася, абмежаванняў не існуе. Праекты могуць быць у розных сферах — сацыяльнай, вытворчай; IT- і бізнес-праекты; ажыццяўляюцца нават футурыстычныя ідэі. У далейшым найбольш цікавыя з іх універсітэт накіроўвае на конкурс «100 ідэй для Беларусі». Напрыклад, сёлета на міжуніверсітэцкі конкурс «купалаўцы» заявілі ажно 16 праектаў, пяць з якіх прадставяць Гродзеншчыну на заключным рэспубліканскім этапе. Праект «Праметэй» — адзін з сацыяльна арыентаваных.

— Прылада распрацавана студэнтам для людзей з інваліднасцю па зроку, — тлумачыць Андрэй Францавіч. — Ідэя падкамеры чалавек з інваліднасцю па зроку можа самастойна хадзіць па горадзе. Трэба толькі задаць шлях, а весці яго будзе галасавы памочнік. Калі ўзнікае праблема, можна звязацца з валанцёрам, які ў рэжыме анлайн падкажа, як яе вырашыць. Сацыяльны праект створаны пры ўзаемадзеянні з таварыствам людзей з інваліднасцю па зроку.

Пакуль гэта толькі прапанова. Галоўнае дасягненне ў навуковых распрацоўках — эканамічны эфект. Толькі за мінулы год тут заключана і рэалізавана 180 гаспадарчых дагавораў з агульным аб'ёмам фінансавання 150 тысяч рублёў. У ліку найбольш значных называюць устаноўку сістэмы біялагічнай ачысткі сцёкавых водаў прамысловых прадпрыемстваў на ААТ «Гродна Азот».

Па заказе прадпрыемства «Радыёхваля» выканана трохвымернае сканіраванне, прататыпіраванне і распрацоўка канструктарскай дакументацыі на прамысловыя дэталі і вырабы. Для рэспубліканскіх ландшафтных заказнікаў «Котра» і «Азёры» распрацавана стратэгія па развіцці экалагічнага турызму і ўладкаванне экалагічнай сцежкі.

Ёсць у «купалаўцаў» і знакавы ці нават брэндавы навукова-тэхнічны праект, у межах якога распрацаваны вакуумныя пакрыцці на аснове карбідаў і вугляродных нанаструктур, што дазваляе павялічыць устойлівасць металаапрацоўчых інструментаў. Як паказалі выпрабаванні на прадпрыемстве «Белкард», інструменты аказаліся ў 3,5 раза больш устойлівымі, чым без пакрыцця. Атрыманыя вынікі даюць падставу для стварэння новых нанатэхналагічных абаронных пакрыццяў для іншых вырабаў. Распрацоўка была прадэманстравана на рэспубліканскіх і міжнародных выставах-кірмашах і выклікала зацікаўленасць прамысловых прадпрыемстваў Расійскай Федэрацыі. А летась на конкурсе ў Санкт-Пецярбургу праект атрымаў сярэбраны медаль і дыплом II ступені.






Цяпер у межах дзяржаўнай праграмы праводзіцца работа па распрацоўцы апаратна-праграмнага комплексу па вывучэнні метадаў і тэхналогій аналізу атмасфернага паветра і паветра, якое выдыхаецца. Для ўдзелу ў абласным конкурсе інавацыйных праектаў ГрДУ рыхтуе прадставіць праект кардыякампрэсара для масажу сэрца пры транспарціроўцы пацыента, а таксама апарат для інтэнсіўнага лячэння атарыналарынгалагічных захворванняў. Пры атрыманні сродкаў абласнога інавацыйнага фонду, навукоўцы гатовыя выпусціць доследную партыю прэпаратаў.

На чарзе — новы праект, які ў ВНУ лічаць прарыўным, бо ён звязаны са стварэннем электрамабіляў і праводзіцца сумесна з Універсітэтам грамадзянскай абароны МНС.

— Мы будзем распрацоўваць трэнажор для навучання ратавальнікаў дзейнічаць па ліквідацыі надзвычайных сітуацый ва ўмовах ДТЗ з удзелам электрамабіляў. Трэба ведаць, як пазбегнуць наступстваў пры здарэнні, напрыклад, пры замыканні, — тлумачыць суразмоўнік. — Праект складаецца з IT-начынкі ў фармаце 3D, каб супрацоўнік МНС на планшэце мог з гэтым аўтамабілем папрацаваць, паглядзець на стан правадоў і прыняць правільнае рашэнне ў канкрэтнай сітуацыі. Начынкай 3D будзе займацца наш студэнт, які з'яўляецца таксама і рэзідэнтам тэхнапарка. Гэта першы навуковы праект, звязаны з электратранспартам. Такі кірунак стаў магчымы дзякуючы адкрыццю ў ГрДУ імя Янкі Купалы спецыяльнасці «аўтаномны электратранспарт». Для студэнтаў закуплены адзіны ў Беларусі трэнажор для навучання — гэта рэальны электрамабіль, які можна разабраць і сабраць.

Праект ажыццяўляецца ў межах дзяржаўнай праграмы, прайшоў дзяржэкспертызу і сёлета плануецца да рэалізацыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота ГрДУ імя Я. Купалы.**

## Падпіска-2023

### ТЫ ЗАЎСЁДЫ ПОМНІ, БРАЦЕ, СА «ЗВЯЗДОЙ» — ЦЯПЛЕЙ У ХАЦЕ!»

**Бо яна — беларуская і родная на роднай мове, бо прыходзіць да чытачоў пяць разоў на тыдзень, бо чыталі яе (з 1917-га!) яшчэ нашы дзяды і прадзеды, бо яна, апроч патрэбных ды цікавых матэрыялаў, радуе падпісчыкаў яшчэ і прызамі.**

Што для гэтага трэба, даўнія і адданыя чытачы добра ведаюць. Для новых, што называецца, пакрокава: па-першае, аформіць падпіску (на квартал альбо паўгоддзе), па-другое, запоўніць адзін з купонаў (друкуюцца разам з праграмай тэлеперадач), па-трэцяе, адправіць яго на адрас «Звязда».

Тут, у рэдакцыі, усе дасланыя рэгіструюцца, размяркоўваюцца па абласцях ды горадзе Мінску, па чарзе «ссыпаюцца» ў чароўны саламяны капялюш і...

Днямі чарговы раз з яго дасталі шчасліўных.

**Пледы TexRepublic новыя ўзоры TF FN F120 а 1520/26218 выйгралі:**

***Ермалаева Жанна Аляксееўна, г. Кобрын Брэсцкай вобласці;***

***Пяркальскі Анатоль Антонавіч, г. Глыбокае Віцебскай вобласці;***

***Лукомская Валянціна Аляксандраўна, аг. Мяркулавічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці;***

***Горбік Дзмітрый Уладзіміравіч, г. Карэлічы Гродзенскай вобласці;***

***Юшко Валянціна Аляксееўна, аг. Нача Крупскага раёна Мінскай вобласці;***

***Харанека Лілія Пятроўна, аг. Іванаўка Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці;***

***Сачанка Аляксандр Іванавіч, г. Мінск.***

**Суперпрыз — Канвектар Ballu Enzo BEC/EZMR-500 — выйграў**

***Шалупенка Васіль Іванавіч, г. Мінск.***

Віншуем тых, каму пашчасціла. Тым, каму не, пакуль нагадаем, што час ляціць вельмі хутка: азірнуцца не паспеем — на парозе новы квартал, новая падпісная кампанія і новыя прызы. Магчыма, вашы?

**Афіцыйна**

Арганізатарам рэкламнай гульні «Звязда» сагравае!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Звязда» саграваe!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 01.12.2023 г. (пасведчанне № 4265) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 7 снежня 2022 года па 31 сакавіка 2023 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2023 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 92 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў 8 (017) 271 81 53.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Белым доме заявілі, што ЗША не плануюць перакідваць дадатковыя войскі ў Польшчу

**Улады Злучаных Штатаў не плануюць павялічваць колькасць сваіх ваенных у Польшчы, заявіў каардынатар па стратэгічных камунікацыях у Савеце нацыянальнай бяспекі Белага дома Джон Кірбі ў інтэрв'ю радыёстанцыі RMF.**

«На сёння ў мяне няма заяў наконт перамяшчэння войск. Мы ўжо павялічылі сваю прысутнасць на еўрапейскім кантыненце на дадатковыя 20 тысяч чалавек, і ў мяне няма ніякіх заяў аднонсна Польшчы», — сказаў ён, адказваючы на пытанне, ці маюць намер ЗША накіроўваць дадатковыя войскі ў гэтую краіну.

Гаворачы пра абмеркаванне паміж Польшчай і Германіяй пытання паставак Украіне танкаў Leopard 2, Кірбі адзначыў, што гэтую праблему павінны вырашыць самі краіны. Пры гэтым Кірбі падкрэсліў, што «найбліжэйшыя тыдні і месяцы будуць вырашальныя для Украіны» і краінам Захаду трэба працягваць працаваць над пастаўкамі ўзбраенняў для Кіева. Пры гэтым прадстаўнік адміністрацыі ЗША не змог адказаць на пытанне аб магчымых пастаўках амерыканскіх танкаў ва Украіну.

### МЗС Фінляндыі: у перагаворах з Турцыяй аб уступленні ў НАТА неабходны тайм-аўт

**У перагаворах паміж Фінляндыяй, Швецыяй і Турцыяй наконт уступлення ў НАТА неабходны перапынак у некалькі тыдняў, заявіў міністр замежных спраў Фінляндыі Пека Хаавіста ў інтэрв'ю Reuters.**

Па словах Хаавіста, Фінляндыя і Швецыя неаднаразова заяўлялі, што планую далучыцца да альянсу адначасова, і гэта не змянілася. «Я не бачу неабходнасці ў абмеркаванні гэтага пытання», — сказаў ён.

Раней прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган заявіў, што Швецыі больш не варта чакаць, што Анкара падтрымае яе заяўку на ўступленне ў НАТА. Ён падкрэсліў, што акцыя са спаленнем Карана стала абразай як для мусульман, так і «наогул усіх людзей, усіх правоў і свабод».

Пры гэтым у ЗША чакаюць уступлення Швецыі ў НАТА, нягледзячы на заяву прэзідэнта Турцыі Эрдагана ў адказ на акцыю па спаленні Карана ў Стакгольме.

### NYT: раман пра Пуціна можа змяніць палітыку Францыі ў дачыненні да Украіны

**Аглядальнік New York Times Канстан Мэё лічыць, што раман пісьменніка Джуліяна ды Эмполі «Крамлёўскі чараўнік», які расказвае пра прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, можа змяніць нацыянальную палітыку Францыі ў адносінах да Украіны.**

«Папулярны раман «Крамлёўскі чараўнік» адлюстроўвае сімпатычны партрэт расійскага лідара і, па словах крытыкаў, выклікае асцярогі з-за таго, што можа паўплываць на нацыянальную палітыку ў дачыненні да ўкраінскага канфлікту», — напісаў Мэё. Раман з'явіўся на свет пасля пачатку расійскай спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне і стаў папулярным «дапаможнікам для разумення Пуціна». Так, былы міністр замежных спраў Францыі Юбер Вердзін адзначыў, што раман «неверагодна праўдападобны» і калі б прэзідэнт Эмануэль Макрон прачытаў гэтую кнігу, то не заняў бы такую агрэсіўную пазіцыю ў адносінах да Расіі.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Алегу Сяргеевічу Макараву, дырэктару Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ЗАКУЛІССЕ ВАЕННЫХ МУЗЫКАЎ

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў кулуарах лаўрэатаў спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва

**Без Узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь складана ўявіць многія дзяржаўныя святы, а тым больш ваенны парад. Пад гучанне музыкі людзей у пагонах перад усёй краінай маршыруюць парадныя разлікі, якія дэманструюць моц і веліч нацыянальнай арміі. Аднак не толькі сваімі бездакорнымі маршамі славяцца артысты. Рэпертуар аркестра настолькі багаты, што літаральна з першых нот ваенныя музыкі кранаюць самага рознага слухача, у якім бы кутку свету яны ні знаходзіліся.**

На працягу свайго існавання — а гэта амаль 73 гады — заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь уносіць важкі ўклад у развіццё айчыннага музычнага мастацтва і ўмацаванне сяброўскіх сувязяў паміж народамі. Музыку, якая гучыць у выкананні ваеннага аркестра, можна пачуць як на пляцоўках беларускіх гарадоў і паселішчаў, так і ў суседняй Расіі, Узбекістане і нават у Кітаі. За значныя дасягненні ў сферы музычнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл быў адзначаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва.

Карэспандэнты «Звязды» завіталі да ваенных музыкаў у госці і трапілі на своеасаблівы канцэрт, які артысты аркестра сціпла называюць рэпетыцыяй.



Максім КАЧАТКОЎ.

### Творцы ў пагонах

Дыплом аб узнагароджанні спецпрэміяй Прэзідэнта ў падраздзяленні знаходзіцца на самым бачным месцы. Ваенныя музыкі не ўтойваюць: ім прыемна, што іх заслугі ацанілі на такім высокім узроўні.

— Гэтая ўзнагарода для нас была вельмі нечаканай, — прызнаецца **начальнік ваенна-аркестравай службы Узброеных Сіл — начальнік Узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь палкоўнік Ігар ХЛЕБУС.** — Мы не ведаем, хто прапанаваў нашу кандыдатуру на спецпрэмію Прэзідэнта. Нават падчас збору дакументаў да канца не верылася, што можам стаць лаўрэатамі. Калі 30 снежня кіраўнік дзяржавы падпісаў адпаведны ўказ, толькі тады ўсвядомілі, што ўзнагароджванне адбудзецца. Безумоўна, гэта не можа не радаваць. Аднак мы ніколі не працавалі дзеля ўзнагарод. Мы проста добрасумленна выконваем сваю работу: рэпеціруем, абнаўляем рэпертуар, пастаянна спрабуем ісці ў нагу з часам. З задавальненнем укараняем у аркестр сучасныя беларускія песні, апрацоўкі. Пастаянна ёсць новыя ідэі. Адным словам, не сядзім на месцы — можа, таму нас і заўважылі.

— Куды патраціце прэмію? — цікаўлюся ў начальніка ваенна-аркестравай службы.

— На паляпшэнне матэрыяльнай базы. Збіраемся набыць новы сінтэзатар.

Здаецца, пра музычныя інструменты, іх гучанне ў тых ці іншых умовах Ігар Хлебус можа гаварыць бясконца. І гэта не дзіва: усё жыццё кіраўніка Узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл звязана з музыкай. Захапіўшыся музычным мастацтвам з самага маленства, Ігар Яўгенавіч скончыў Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І. Ахрэмчыка (цяпер Гімназія-каледж мастацтваў імя І. Ахрэмчыка). Пасля паступіў на ваенна-дырыжорскі факультэт Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, па заканчэнні якога трапіў дырыжорам у танкавы полк. У 2001-м годзе яму прапанавалі ўзначаліць аркестр 56-га асобнага палка сувязі Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны, ад чаго складана было адмовіцца. Пасля Ігар Хлебус з'яўляўся начальнікам аркестра ганаровай варты. Ва ўзорна-паказальны аркестр перайшоў у 2013 годзе: быў спачатку намеснікам начальніка ваенна-аркестравай службы, а ў 2019 годзе ўзначаліў і службу, і аркестр.

Ігар Хлебус перакананы: творчаму чалавеку ніякім чынам не могуць перашкодзіць пагоны. Наадварот, карысці ад гэтага нашмат больш: з аднаго боку, ты — музыка, з другога — ваеннаслужачы. «Дысцыпліна, фізічная падцягнутасць — тое, што мяне заўсёды прыцягвала, — адзначае палкоўнік. — Гэтага патрабуем і ад асабовага складу. Добры фізічны стан, вонкавы выгляд, страявая падрыхтоўка — усё гэта непарыўна звязана з нашай дзейнасцю. Калі мы на пляцы, а задачай любога ваеннага аркестра з'яўляецца забеспячэнне воінскіх рытуалаў (страявыя агляды, разводы варты, парады), дэманструецца наша страявая вывучка. Разам з тым мы яшчэ і іграем. Гэта ўдвая складаней, затое вельмі прыгожа».

### На ўсе часы

Дзе толькі за сваю гісторыю не пабывалі музыкі ўзорна-паказальнага аркестра. Ім апладзіравалі і на Краснай плошчы, і на Далёкім Усходзе, і на буйнейшых пляцоўках Еўропы. Нацыянальнае музычнае мастацтва, аўтарская інтэрпрэтацыя класікі заўсёды з поспехам успрымаецца ў замежнай аўдыторыі.







— Нягледзячы на тое што, пачынаючы з 2020 года, мы перасталі ездзіць у Еўропу, музыкі аркестра не пакутуюць ад адсутнасці гастрольнай дзейнасці, — заўважае Ігар Хлебус. — У мінулым годзе мы наведвалі і Хабараўск, і Узбекістан. Штогод ездзім у Маскву на фестываль «Спаская вежа». Вельмі шмат выступаем па Беларусі. Адназначна не сядзім на месцы. Ды і музыкі не любяць гэтага. Для іх галоўнае — не ўзнагароды, а тое, як іх прымаюць гледачы і слухачы.

Музыка, па словах кіраўніка ваенна-аркестравай службы Узброеных Сіл, мае значэнне ў любы час. «Калі пачалася спецыяльная ваенная аперацыя ва Украіне, народ быў перапалоханы, многія пыталіся, а што ў гэты няпросты перыяд робім мы, ваенныя музыкі, — згадвае Ігар Хлебус. — Мы ствараем, па-ранейшаму ездзім па воінскіх часцях, іграем для ваеннаслужачых. У падраздзяленнях па-ранейшаму адбываюцца канцэрты, урачыстыя сходы. Музыка — неад'емная частка жыцця любога чалавека».



Уладзімір ЯСКЕВІЧ.

Музыка часам неабходная нават там, дзе, здаецца, увогуле не да весялосці. Гэта пацвярджае і **заслужаны артыст БССР, народны артыст Беларусі Уладзімір ЯСКЕВІЧ,** які ўжо на працягу амаль 30 гадоў з'яўляецца вядучым салістам Узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл. Будучы артыстам ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Уладзімір Мікалаевіч тройчы быў у Афганістане, калі там вяліся баявыя дзеянні. Ён дагэтуль памятае, наколькі тады была неабходная творчасць ваенных музыкаў.

— Канцэрты праходзілі ўсюды: і ў шпіталях, нават у палатках для параненых, — расказвае народны артыст Беларусі. — Выступалі і для дваіх параненых. Нашы песні станоўча ўплывалі на гэтых людзей: у іх паляпшаўся настрой, узмацнялася вера ў тое, што яны абавязкова вернуцца да звычайнага жыцця. Сумныя песні мы не спявалі — аб гэтым прасілі нашы камандзіры.

Уладзімір Яскевіч распавёў, што, нягледзячы на працоўны стаж у ваенным аркестры без нечага ў 30 гадоў, з калектывам ён звязаны яшчэ больш — з 1976 года. Як саліст ансамбля песні і танца артыст рэгулярна ўдзельнічаў у гастрольным жыцці аркестра.

Уладзімір Мікалаевіч называе свой рэпертуар плакатным: гэта ваенныя і патрыятычныя кампазіцыі. «Ён заўсёды быў неабходны, — звяртае ўвагу заслужаны артыст БССР. — Я ніколі не займаўся поп-музыкай, нейкімі лёгкімі рэчамі. З такім рэпертуарам, як у мяне, цяжка выступаць у школах, на летніх пляцоўках, куды народ, як правіла, прыходзіць павесяліцца, пагаварыць, прагуляцца. Такая публіка, як салдацкая, афіцэрская, іх сем'і, заўсёды чакае іншы рэпертуар. Гэта публіка падрыхтаваная, выхаваная, удзячная, надзейная, тая, якая ўсё разумее. Такіх гледачоў я б не памяняў ні на якія гучныя апладысменты, авацыі і крыкі «на біс». Гэта мая публіка, я яе люблю. Нават калі чую дватры воплескі, я ведаю, што песня ў чалавека ўвайшла і засталася ў ім».

### Рэпертуар — справа тонкая

За рэпертуар узорна-паказальнага аркестра ў найбольшай ступені адказвае яго **мастацкі кіраўнік — галоўны дырыжор Узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь палкоўнік Максім КАЧАТКОЎ.** Выпускнік Маскоўскай ваеннай кансерваторыі ў аркестры — 18 гадоў. Прайшоў усе пасады: ад ваеннага дырыжора-тамбурмажора да мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора.

— Паколькі ў складзе аркестра шмат калектываў — гэта і вялікі духавы аркестр, і эстрадны аркестр са струннай групай, і біг-бэнд, — увесь рэпертуар фарміруецца пад кожны склад аркестра, — уводзіць у курс справы Максім Качаткоў. — Духавы аркестр у нас іграе і духавую, і ваенна-патрыятычную музыку, і эстрадную музыку, якая выкарыстоўваецца ў пляц-канцэртах (дэфіле). Калі ёсць такая неабходнасць, духавы аркестр здольны выканаць і акампанемент. Па гарнізонах мы звычайна ездзім эстрадным аркестрам.

Ваенныя музыкі адзначаюць: у кожнай публікі — свае перавагі. Невыпадкова гастрольнай дзейнасці папярэднічае сур'ёзная падрыхтоўка. Рэпертуар плануецца з улікам геаграфіі гастроляў. «Кожнаму гледачу мы імкнёмся паказаць, што ваенны аркестр — гэта не калектыў, які іграе толькі вальсы і маршы, — звяртае ўвагу мастацкі кіраўнік узорна-паказальнага аркестра. — Мы паказваем людзям, што цяперашнія ваенныя аркестры рухаюцца ў нагу з часам. Мы іграем усё: ад класікі да джаза, ад рока да самай сучаснай поп-музыкі. Калі мерапрыемства патрыятычнага характару — адпаведны і наш рэпертуар. Калі ж прадугледжаны забаўляльны канцэрт, мы імкнёмся не перагружаць аўдыторыю кампазіцыямі адной тэматычнай скіраванасці. У воінскіх часцях пазбягаем лёгкасці: імкнёмся акунуць салдат у такую музыку, каб яны не толькі паслухалі, але і падумалі».

Ахвотнікаў трапіць у калектыў нямала. Асаблівы ажыятаж назіраецца з боку маладых людзей прызыўнога ўзросту. Аднак пасля праходжання тэрміновай службы многія застаюцца ў аркестры. Тут яны набываюць не толькі двайную прафесію — вайскоўцаў і музыкаў: у маладых людзей з'яўляецца ўнікальная магчымасць сумяшчаць прафесійныя абавязкі з любімай справай, працаваць побач з таленавітымі і заслужанымі музыкамі, якія прысвяцілі сваёй прафесіі большую частку жыцця.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Тонкасці прафесіі

# ВУЧОНЫЯ Ў ПАГОНАХ

## Якія распрацоўкі вядуцца ў абароннай сферы і ці паспявае ваенная навука за тэхнічным развіццём?

**Практычна любая сфера жыццядзейнасці патрабуе навуковага суправаджэння. Менавіта навука часта вызначае арыенціры, куды варта рухацца далей. І ваенная сфера — не выключэнне. Ад таго, наколькі тэорыя ваеннай навукі адпавядае нацыянальным інтарэсам дзяржавы, улічвае сучасныя выклікі і пагрозы, залежыць не проста эфектыўнасць прымянення войскаў у баявых дзеяннях, а ўвогуле развіццё і будаўніцтва Узброеных Сіл. Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў Навукова-даследчым інстытуце Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і пацікавіліся, якімі распрацоўкамі займаюцца людзі, што адказваюць за навуковае вырашэнне праблем ваеннай бяспекі дзяржавы і развіццё сучаснай арміі.**

### З УЛІКАМ НОВЫХ ВЫКЛІКАЎ І ПАГРОЗ

Навукова-даследчы інстытут Узброеных Сіл — адносна маладая арганізацыя: летась яна адзначыла 20-годдзе. Аднак і гэтага часу хапіла, каб стаць запатрабаванай не толькі ўнутры краіны (штогод колькасць заказаў на навуковыя даследаванні ад органаў ваеннага кіравання расце), але і за мяжой: з мінулага года навукова-даследчы інстытут з'яўляецца базавай навуковай арганізацыяй краін — удзельніц СНД у правядзенні даследаванняў у галіне ваеннай бяспекі.

Акрамя таго, інстытут ажыццяўляе навукова-арганізацыйнае забеспячэнне работы Узброеных Сіл, Ваенна-навуковага савета Міністэрства абароны, Геральдычнага савета Узброеных Сіл. Вучоныя ўносяць прапановы ў канцэпцыі, праграмы і статутныя дакументы Узброеных Сіл, распрацоўваюць рэкамендацыі па развіцці сістэм і ўзораў узбраення і ваеннай тэхнікі. І гэта далёка не поўны спектр задач дзяржаўнай установы. Безумоўна, істотная частка дзейнасці інстытута — навуковыя распрацоўкі.



— Мы праводзім фундаментальныя і прыкладныя даследаванні па ўсіх практычных кірунках ваеннай навукі, — адзначае **начальнік Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл палкоўнік Руслан ГРУШКО.** — Распрацоўкі ажыццяўляюцца ў галіне тэорыі ваеннай навукі, ваеннага мастацтва, стратэгіі, ваеннага будаўніцтва, тэорыі відаў аператыўнага забеспячэння, баявога забеспячэння, тэорыі тылу, узбраення. Акрамя таго, нашы вучоныя займаюцца ваеннай гісторыяй, геральдыкай. Прыкладныя даследаванні таксама праводзяцца ў інстытуце. Калі казаць аб асноўных дасягненнях у галіне, варта адзначыць шэраг работ па стварэнні перадатчыкаў малагабарытных перашкод. Дзякуючы гэтым перадатчыкам вайсковыя падраздзяленні могуць бяспечна перамяшчацца.

Яшчэ адна з распрацовак вучоных інстытута, якая дае падставу для гонару, — сістэмы падпаверхневага зандзіравання, якія вызначаюць наяўнасць выбуханебяспечных прадметаў у зямлі, сцяне або пад іншай паверхняй. Працягваецца навукова-даследчая работа па стварэнні нейрасеткавай мадэлі, якая ў аўтаматычным рэжыме дазваляе апрацоўваць інфармацыю, перададзеную беспілотнымі лятальнымі апаратамі. Зроблены першы крок і па распрацоўцы артылерыйскіх сістэм для ажыццяўлення контрбатарэйнай барацьбы, якія дазваляюць вызначыць месца размяшчэння праціўніка, што вельмі актуальна з улікам вопыту ва Украіне.

— Усе даследаванні, якія цяпер вядуцца ў інстытуце, разглядаюцца праз прызму таго, што адбываецца ва Украіне, — заўважае Руслан Грушко. — У навуковым плане гэта своеасаблівае землетрасенне: усе догмы, якія ўсталяваліся, церпяць ваенна-навуковыя змяненні. А для таго каб перайсці да практыкі іх прымянення, неабходна разабрацца, як змяняецца тэорыя. Таму на першым этапе мы разбіраемся з тэарэтычнымі праблемамі, якія ўзнікаюць падчас спецыяльнай ваеннай аперацыі. У прыватнасці, класічнае выкарстанне буйных вайсковых фарміраванняў паказвае, што поспех не дасягаецца — наносяцца вялікія страты. Усё гэта аналізуем і выпрацоўваем рэкамендацыі для іх прымянення ў баявой і аператыўнай падрыхтоўцы нашых вайскоўцаў.

Ваенная навука не стаіць на месцы, яна дынамічная. Тыя ж сучасныя выклікі і пагрозы патрабуюць новых падыходаў да выкарыстання зброі, кіравання войскамі і іншага. Як звяртае ўвагу начальнік навукова-даследчага інстытута, разам з абнаўленнем узбраення мяняецца і менталітэт людзей. «У гады Вялікай Айчыннай вайны савецкія войскі вызвалілі левабярэжную Украіну за 45 сутак, — прыводзіць красамоўны прыклад ён. — Пры гэтым страты вызначаліся сотнямі тысяч загінулых. Ці гатовая сёння якая-небудзь краіна для дасягнення сваіх мэт пакласці сотні тысяч людзей? Вядома, не. Вось і прыклад змены менталітэту. Гэта ўплывае на тое, якім чынам будуць дасягацца мэты. Цяпер асноўным прыярытэтам у правядзенні любых баявых дзеянняў з'яўляецца захаванне жыцця салдат. Для таго каб захаваць іх жыццё, а праціўніку нанесці паражэнне, выкарыстоўваюцца ўдары агнём. Такім чынам, на ваенную навуку, аператыўнае мастацтва, стратэгію і тактыку ўплывае не толькі зброя, але і тое, што ў галовах людзей. Безумоўна, немалаважны ў гэтым плане і эканамічны патэнцыял краіны».



Экспанаты музея Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл.

### З АПЯРЭДЖАННЕМ ЧАСУ

**Вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл Барыс САЛАГУБІК** стаяў каля вытокаў нацыянальнай ваеннай навукі. Даследаваннямі ў галіне бяспекі і абароны ён займаўся яшчэ да таго, як была створана дзяржаўная ўстанова. «Гэта быў вельмі складаны час: калі мы сталі незалежнай дзяржавай, фундаменту ваеннай навукі ўвогуле не было, — узгадвае кандыдат ваенных навук, дацэнт. — Нашым Узброеным Сілам,



якія толькі былі створаны, патрабавалася навуковае суправаджэнне. А навуковых устаноў на тэрыторыі Беларусі ваеннай скіраванасці не існавала. Функцыянавалі толькі дзве ваенныя ВНУ. Гэта адна з прычын, якая паўплывала на тое, што я прыехаў у Беларусь».

Дагэтуль Барыс Салагубік працаваў у Навукова-даследчым інстытуце абароны ў Ленінградзе. Амаль усё жыццё прысвяціў даследаванням у ваеннай галіне.

— Узброеныя Сілы могуць абысціся без навуковага суправаджэння? — цікаўлюся ў вопытнага даследчыка, аўтара шэрагу найважнейшых у ваеннай сферы дакументаў.

— Гэта немагчыма! — перакананы Барыс Салагубік. — Тым больш сёння. Цяпер настолькі ўсё імкліва развіваецца. Тактыка, стратэгія, аператыўнае мастацтва больш інертныя, але тэхнічны складнік узбраення імкліва развіваецца. А тактыка і ўзоры ўзбраення ўзаемадзейнічаюць — гэта трэба пастаянна адсочваць і ўносіць прапановы па іх выкарыстанні. Наша арганізацыя і задумвалася для таго, каб распрацоўваць прапановы з апярэджаннем хоць бы на пяць, а лепш на 10—15 гадоў наперад. Без нашай работы ўсвядомленага эфектыўнага руху наперад не будзе.

Гэта пацвярджае і **галоўны навуковы супрацоўнік 4-га навукова-даследчага ўпраўлення**




**Мікалай ЛІСЕЙЧЫКАЎ,** які ў навукова-даследчым інстытуце працуе з другога дня яго стварэння. На працягу ўсіх гэтых двух дзясяткаў гадоў вучоны займаецца даследаваннямі ў галіне тэорыі ўзбраення і тылу. У прыватнасці, доктар тэхнічных навук вывучаў выбухова-пажаранебяспечнасць арсеналаў, баз, складоў боепрыпасаў.



— Па міжнароднай класіфікацыі боепрыпасы і выбуховыя рэчывы з'яўляюцца найбольш небяспечнымі грузамі класа 1, таму для іх захоўвання прымаюцца спецыяльныя меры, — тлумачыць Мікалай Лісейчыкаў. — Аднак, нягледзячы на гэта, статыстыка надзвычайных сітуацый паказвае, што раней ці пазней у месцах захоўвання боепрыпасаў адбываюцца выбухі — гінуць людзі, наносяцца вялікія матэрыяльныя страты, непазбежныя экалагічныя наступствы. Каб не дапусціць гэтага, мы прапанавалі мерапрыемствы, якія трэба праводзіць для таго, каб знізіць рызыку з'яўлення пажараў на такіх аб'ектах. Калі ўсё ж такі выбуху або пажару пазбегнуць не ўдалося, мы стварылі алгарытм дзеянняў, якія трэба ажыццявіць загадзя, каб мінімізаваць наступствы.

Шэраг задач прафесару даводзілася вырашаць і ў сферы тылавога забеспячэння. Напрыклад, згодна з рэкамендацыямі Мікалая Іванавіча, у свой час быў удасканалены рацыён харчавання салдат. Цяпер за збалансаванасць рацыёну бацькі ваеннаслужачых могуць не хвалявацца.

### БЕЗ ВАЙСКОВАГА ВОПЫТУ НЕ АБЫСЦІСЯ

У ваеннай навуцы няма выпадковых людзей. Сюды нельга прыйсці, каб «адкасіць» ад арміі, як часта бывае ў грамадзянскай сферы. Наадварот, каб праводзіць даследаванні ў ваеннай галіне, людзі павінны пабыць у армейскім асяроддзі — панюхаць пораху, як у народзе кажуць. Невыпадкова ў Навукова-даследчым інстытуце Узброеных Сіл усе без выключэння — афіцэры: дзеючыя, у запасе, у адстаўцы.

Улічваючы, што арганізацыя невялікая, навуковы патэнцыял тут вельмі сур'ёзны: у інстытуце працуюць пяць дактароў навук і 19 кандыдатаў навук — ваенных, палітычных, тэхнічных. Тут можна сустрэць як маладых ад'юнктаў, якія толькі пачынаюць шлях у ваенную навуку, так і вядучых у краіне вучоных, заслужаных дзеячаў навук. Навукова-даследчы інстытут ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі (у дактарантуры і ад'юнктуры). На базе дзяржаўнай установы створаны Савет па абароне дысертацый — кожны год вучоныя паспяхова абараняюць навуковыя даследаванні.

Начальнік дзяржаўнай установы, які, акрамя воінскага, мае яшчэ і вучонае званне, ступень (Руслан Леанідавіч — кандыдат ваенных навук, дацэнт), звяртае ўвагу на тое, што ў інстытуце створаны ўнікальныя магчымасці, каб вучыцца і расці. «Самае галоўнае, чаго мы дасягнулі за 20 гадоў, — той калектыў, які тут працуе, — адзначае Руслан Грушко. — Менавіта ён дазваляе часам у сціслыя тэрміны вырашаць задачы, пастаўленыя ваенна-палітычным кіраўніцтвам, прымаць абгрунтаваныя рашэнні на аснове падрыхтаванай інфармацыі».

Дарэчы, да патэнцыйных даследчыкаў у галіне ваеннага мастацтва супрацоўнікі інстытута прыглядаюцца яшчэ з курсанцкай лаўкі. Напрыклад, на цяперашні час у рэзерве навуковых кадраў установы знаходзяцца двое курсантаў Ваеннай акадэміі. Маладыя людзі паказалі добрыя вынікі на навуковых канферэнцыях. Аднак, перш чым заняцца ваеннымі распрацоўкамі, давядзецца паслужыць у войсках — гэты вопыт для вучонага ў пагонах проста неабходны.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ПАДАТАК НА ПРАФЕСІЙНЫ ДАХОД: усе нюансы пра новы падатковы рэжым

**З першых дзён гэтага года для жыхароў нашай краіны быў уведзены спецыяльны падатковы рэжым — падатак на прафесійны даход (ППД). Як вядома, такі падатак прадугледжаны для тых асоб, хто працуе самастойна, не мае наймальніка і выконвае шэраг іншых неабходных умоў. Пры пераходзе на новы падатковы рэжым узнікае шмат тонкасцяў і дэталяў. У сувязі з гэтым былі падрыхтаваны самыя важныя пытанні такой тэматыкі, на якія адказаў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.**

## Самы справядлівы рэжым падаткаабкладання

Сярод нашых чытачоў таксама шмат прадпрымальнікаў. Гэтыя людзі досыць актыўна карыстаюцца нашай рэдакцыйнай электроннай поштай. Кожнае другое пытанне ад іх датычылася ўвядзення новага падатковага рэжыму: для чаго трэба было ўводзіць яго?

Андрэй Кавалеўскі лічыць, што ў папярэднія гады фізічныя асобы, якім не патрабавалася рэгістрацыя ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, маглі ўжываць розныя падатковыя рэжымы, як правіла, заснаваныя на фіксаваным плацяжы, што не залежала ад атрымананага даходу. Але гэта выклікала шэраг сумненняў і супярэчнасцяў. У прыватнасці, адзіны падатак аплачваўся наперад, і магло здарыцца так, што плацельшчык не змог зарабіць нават гэтую суму альбо з нейкіх абставін не змог весці дзейнасць.

Таму было прынята рашэнне выпрацаваць новы падатковы рэжым — падатак на прафесійны даход. Яго ключавая асаблівасць у тым, што абкладаецца падаткам непасрэдна атрыманы даход. Цяпер, калі ёсць даход, з яго аплачваецца падатак, няма даходу — нічога плаціць не трэба. У сусветнай практыцы такія рэжымы падаткаабкладання лічацца найбольш перспектыўнымі, бо яны самыя справядлівыя.

Наш эксперт адзначае, што пераход на спецыяльны падатковы рэжым з'яўляецца добраахвотным, таму што сам плацельшчык вырашае, трэба тое яму ці не. Ніякай абавязковасці тут няма. Але гэта зручная альтэрнатыва тым падатковым рэжымам, якія выкарыстоўваліся раней.

Тут трэба ўдакладніць, што плацельшчыкамі падатку на прафесійны даход з'яўляюцца фізічныя асобы, якім не патрабуецца рэгістрацыя ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. У гэтай сувязі спецыяліст тлумачыць, што калі індывідуальны прадпрымальнік займаўся якім-небудзь відам дзейнасці, які на сёння дазволены плацельшчыкам прафесійнага падатку, тады ён можа спыніць прадпрымальніцкую дзейнасць і смела перайсці на новы падатковы рэжым.

## Без наёмных работнікаў і на пэўныя віды дзейнасці

Асноўнае пытанне ад прадпрымальнікаў датычылася ўмоў, якія павінны выканаць фізічныя асобы, каб выплачваць падатак на прафесійны даход.

Тут усё выразна. Па дзейнасці, даход ад якой абкладаецца ППД, такія асобы не павінны мець наймальніка і прыцягваць наёмных работнікаў. З першым зразумела: наймальнік — гэта юрыдычная асоба альбо іншая фізічная асоба, якая дае месца работы па працоўным дагаворы. Што датычыцца другой умовы: аплата падатку на прафесійны даход (ППД) прадугледжвае самастойную прафесійную дзейнасць фізічнай асобы, якая валодае нейкімі навыкамі. Калі ёсць неабходнасць прыцягваць наёмных работнікаў, то трэба альбо рэгістравацца ў якасці прадпрымальніка, альбо ствараць юрыдычную асобу.

Калі ў плацельшчыка ППД ёсць асноўнае месца работы, ён можа быць нават зарэгістраваны як ІП, але вядзе абсалютна іншую дзейнасць самастойна, то мае права прымяняць гэты рэжым. Прывядзём просты прыклад. Чалавек працуе на заводзе, але ў вольны час гатовы аказваць паслугі цырульніка або рэпетытара, выконваць нейкія віды будаўнічых, аздобных работ. У такім выпадку ў яго няма ніякіх перашкод. Ён атрымлівае прафесійны даход.

Андрэй Кавалеўскі асобна спыніўся на відах дзейнасці, якія дазволены плацельшчыкам падатку на прафесійны даход. Ён адзначыў, што па дадзенай тэме ёсць два асноўныя дакументы. Першы — пералік відаў дзейнасці, устаноўлены пастановай Савета Міністраў ад 8 снежня 2022 года № 851. Ён уключае ў сябе тыя віды, якія і раней былі дазволеныя фізічным асобам, напрыклад, плацельшчыкам адзінага падатку. Гэта значыць, тыя, якія грамадзяне могуць ажыццяўляць самастойна і без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Гэта паслугі цырульні, распрацоўка вэб-сайтаў, рэпетытарства, фотаздымка, паслугі па прыборцы памяшканняў, здача жылых памяшканняў, якія належаць на праве ўласнасці, для кароткатэрміновага пражывання. Гэта і арэнда маёмасці, але пры ўмове, што яна не прыводзіць да прадпрымальніцкай дзейнасці. Калі два і больш памяшканні здаюцца адначасова, то гэта адназначна прадпрымальніцкая дзейнасць, яе можна весці толькі як індывідуальны прадпрымальнік або юрыдычная асоба.

## Фрылансерства і інтэрнэт

З новага года існуюць дадатковыя віды дзейнасці, якія вызначаны ў артыкуле 7 Закона ад 30 снежня 2022 года № 230-З «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Там прадугледжаны абсалютна новы від — фрылансерства. Што гэта значыць? Фізічная асоба выконвае работы або аказвае паслугі, пры гэтым заказ і вынік перадаюцца з выкарыстаннем інтэрнэту. Такая дзейнасць таксама можа абкладацца падаткам на прафесійны даход. У першую чаргу гэта IT-паслугі, але не толькі. Гэта любая дазволеная для фізічных асоб дзейнасць, якая вядзецца праз інтэрнэт. Але калі заказ на вытворчасць тавараў знайшоў у інтэрнэце, а тавары адправіў заказчыку поштай — гэта ўжо не тое. Ключавое правіла: заказ узяты ў інтэрнэце, вынік перададзены праз інтэрнэт.

Акрамя таго, спецыяліст адзначыў, што віды дзейнасці, якую грамадзяне могуць весці без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, прыведзены ў артыкуле 1 Грамадзянскага кодэкса.

Цяпер ужо паступаюць дадатковыя пажаданні па пашырэнні відаў дзейнасці. У планах Міністэрства па падатках і зборах — аналізаваць гэтыя звароты і прапрацоўваць з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі. Плануецца, што сёлета, пасля аналізу пажаданняў грамадзян, у выпадку падтрымкі іншымі дзяржорганамі, будуць унесены прапановы па карэкціроўцы Грамадзянскага кодэкса і пашырэнні пераліку відаў дзейнасці для плацельшчыкаў падатку на прафесійны даход.

## Прастата і зручнасць

Цікава, а ў чым перавагі новага падатковага рэжыму, чаму на яго пажадана пераходзіць? Андрэй Кавалеўскі тлумачыць, што ППД заснаваны на прастаце і выгадзе яго прымянення плацельшчыкам. У першую чаргу гэта дыстанцыйнае ўзаемадзеянне з падатковым органам з дапамогай мабільнай праграмы — дадатку. Дадатак дазволіць стаць на падатковы ўлік (калі раней не былі), зарэгістравацца ў якасці плацельшчыка падатку на прафесійны даход, здзяйсняць аперацыі, фіксаваць суму атрыманага даходу, якая будзе аўтаматычна перадавацца ў падатковыя органы. Чэк аб аперацыі будзе перадавацца спажыўцу, заказчыку. Яго можна перадаць рознымі спосабамі: даць адсканаваць QR-код, накіраваць на любы месенджар, СМС-паведамленнем, пры неабходнасці раздрукаваць. Пры гэтым не патрабуецца выкарыстоўваць нейкія касавыя апараты альбо тэрміналы для прыёму плацяжоў. Усё робіцца праз смартфон.



Акрамя таго, не патрабуецца прадстаўляць ніякіх падатковых дэкларацый, справаздачнасці. Усе сумы аўтаматычна паступаюць у інфармацыйныя рэсурсы падатковых органаў. Разлік падатку таксама ажыццяўляецца падатковым органам. Пасля завяршэння месяца да 10-га числа ён паведамляе плацельшчыку ў дадатку аб аплаце сумы падатку. Выплачваць трэба не пазней чым 22-га числа наступнага месяца.

Характэрна, што дадатак мае шмат розных функцыянальных магчымасцяў: дазваляе не толькі фарміраваць чэкі, але і выводзіць аналітыку. Дадатак можна інтэграваць з рахункам і прымаць аплату ў безнаяўным парадку праз банкаўскія карткі. Можна выстаўляць рахункі праз АРІП. Але, зноў жа, пры ўмове, калі плацельшчык заключыць дагавор на абслугоўванне з банкам, адкрые рахунак фізічнай асобы і будзе з ім працаваць. Наш эксперт падкрэслівае: гэта не нейкія спецыяльныя рахункі — гэта звычайны рахунак фізічнай асобы, з якой можна дадаткова выпусціць картку і выкарыстоўваць сродкі.

## Для пенсіянераў стаўка 4 %

На думку падаткавікоў, стаўкі падатку на прафесійны даход вельмі выгадныя і цікавыя плацельшчыкам. Асноўная стаўка складае 10 % ад атрыманага даходу. Калі грамадзянін працуе з фізічнымі асобамі альбо замежнымі арганізацыямі, стаўка падатку заўсёды 10 % незалежна ад памеру атрыманага даходу. Калі з беларускімі арганізацыямі — то ў межах 60 тысяч рублёў стаўка падатку складае 10 %, звыш гэтай сумы — 20 %.

Плюс дадзенай стаўкі падатку ў тым, што яна ўключае ў сябе як падатковы плацеж у бюджэт, так і адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) на пенсіённае страхаванне. Гэта значыць, не патрабуецца дадатковай выплаты ў ФСАН. Атрымлівавецца, што 10 % — адзіны плацёж, які далей сіламі падатковых і фінансавых органаў размяркоўваецца: частка накіроўваецца ў бюджэт, частка — у ФСАН для пенсіённых накапленняў. Пры гэтым плацельшчыку не патрабуецца дадаткова звяртацца ў органы фонду — яго на ўлік паставяць на падставе звестак ад падатковых органаў.

А вось актыўныя людзі, якія атрымліваюць пенсіі, вызвалены ад выплаты адлічэнняў у ФСАН. Таму для асоб, якія атрымліваюць любы від пенсіі (па ўзросце, па інваліднасці), стаўка падатку памяншаецца да 4 %.

У якасці дадатковых ільгот прадугледжаны падатковы вылік у памеры 2 тысяч рублёў. Гэта тая сума даходу, якая не абкладаецца падаткам. Іншымі словамі, падатковая база змяншаецца на 2 тысячы рублёў. Напрыклад, плацельшчык зарабіў 500 рублёў, адпаведна падатак аплачваць не трэба. Калі ён нарэшце зарабіць суму больш за 2 тысячы рублёў, то з сумы перавышэння ён пачне плаціць падатак на прафесійны даход. Але варта адзначыць, што дадзеная льгота ўжываецца толькі для асоб, упершыню зарэгістраваных плацельшчыкамі ППД. Калі дзейнасць работніка будзе спынена і пра гэта будуць апавешчаныя падатковыя органы праз дадатак, а пасля фізічная асоба прыме рашэнне яе аднавіць, то вылік не аднаўляецца і зноў не прадстаўляецца.

## Прыватныя выпадкі з жыцця

Нашы чытачы пытаюцца: як быць, калі стаўка падатку павінна быць паніжана ў сувязі з інваліднасцю, але дадатак аўтаматычна лічыць 10 %? Ці магчыма яе неяк змяніць?

Наш эксперт тлумачыць, што падатковы дадатак праводзіць папярэдні разлік падатку. У выніковай суме падатку, якую разлічвае падатковы орган і інфармуе плацельшчыка да 10-га дня, будзе ўлічвацца інфармацыя аб атрыманні плацельшчыкам пенсіі па ўзросце і інваліднасці. Так што ў дадатку вы заўсёды будзеце бачыць папярэднюю суму, а ўжо пасля заканчэння справаздачнага месяца падатковы орган палічыць падатак з улікам права на льготу. У дадзеным выпадку ён будзе вылічаны па стаўцы 4 %.

А што рабіць у тыя месяцы, калі не быў атрыманы даход? Ці трэба плаціць нейкі фіксаваны падатак?

ППД аплачваецца менавіта ад атрыманага даходу. Даход ёсць — значыць, па выніках месяца плацім падатак. Даходу няма — ніякіх плацяжоў рабіць не патрабуецца. І тым больш не трэба спыняць дзейнасць, калі вы ў далейшым плануеце яе працягваць. Напрыклад, у студзені плацельшчык устанавіў мабільную праграму, зарэгістраваўся, паведаміў падатковыя органы аб пачатку дзейнасці. У студзені атрымаў даход, у лютым заплаціў за яго падатак. Потым у лютым і сакавіку даходу ў яго не было, значыць, плаціць не трэба. У маі быў атрыманы даход, значыць, па выніках месяца зноў выплачваецца падатак. Так што ППД — просты рэжым, заснаваны на прынцыпе: зарабіў — заплаціў падатак. Яго перавагі будуць спрыяць росту колькасці плацельшчыкаў.

## Больш за ўсё цырульнікаў і рэпетытараў

Пасля Новага года прайшло не так шмат часу. А ці шмат тых, хто ўжо перайшоў на новы падатковы рэжым?

Паводле статыстыкі падатковых органаў, па стане на 19 студзеня прымяненне дадзенага падатковага рэжыму пачалі практычна 15,5 тысячы фізічных асоб. Праз мабільную праграму імі ўжо праведзена звыш 70 тысяч аперацый на суму больш за 4 мільёны рублёў. Асноўныя віды паслуг, якія найбольш запатрабаваныя ў плацельшчыкаў падатку на прафесійны даход, — гэта цырульні і касметычныя паслугі, рэпетытарства. Пераважная большасць праведзеных разлікаў — менавіта па такіх відах дзейнасці. Іншыя віды дзейнасці таксама карыстаюцца папулярнасцю, няхай і не такой вялікай. Гэта і фотаздымка, і арэнда маёмасці, і сдача жылых памяшканняў для кароткатэрміновага пражывання, рамонт адзення, абутку і гэтак далей. Так што ўсе віды дзейнасці запатрабаваны нашымі плацельшчыкамі. Тыя, хто ўжо паспрабаваў выкарыстоўваць дадатак і дадзены рэжым, ацанілі яго зручнасць і прастату.

***— Дзе знайсці адказы тым, хто хоча высветліць яшчэ нейкія нюансы?***

— Міністэрства па падатках і зборах плануе ў найбліжэйшы час запусціць дадатковы сэрвіс на афіцыйным сайце падатковых органаў з пытаннямі і адказамі, — заўважыў Андрэй Кавалеўскі.

## Мабільны дадатак «Прафдаход» для сталіцы

Міністэрства па падатках і зборах Мінска інфармуе, што з 1 студзеня 2023 года ўводзіцца дадатковы асаблівы рэжым падаткаабкладання «Падатак на прафесійны даход», для прымянення якога фізічная асоба абавязана выкарыстоўваць лічбавую платформу — мабільны дадатак «Прафдаход» з выкарыстаннем смартфона або камп'ютара (уключаючы планшэтны), далучанага да сеткі інтэрнэт.

Фізічная асоба, якая выказала жаданне перайсці на прымяненне падатку на прафесійны даход, абавязана да пачатку ажыццяўлення дзейнасці: устанавіць на свой смартфон або камп'ютар мабільны дадатак «Прафдаход»; праінфармаваць падатковы орган праз дадатак «Прафдаход» аб прымяненні падатку на прафесійны даход. З падрабязнай інфармацыяй аб выкарыстанні мабільнага дадатку «Прафдаход» можна азнаёміцца на сайце МПЗ у спецыяльна створанай і размешчанай у раздзеле «Актуальна» старонцы «Падатак на прафесійны даход» па спасылцы https://www.nalog.gov.by/professional_income_tax/mobile.php.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Мясцовае самакіраванне
25 студзеня 2023 г. № 3 (689)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# НА МЕСЦАХ — ПАРАДАК, ДА ЛЮДЗЕЙ — ПАВАГА

## Падрабязнасці рабочай паездкі Старшыні Савета Рэспублікі ў Лепельскі раён



**Шляхі вырашэння дэмаграфічнай праблемы, рэальная, а не фармальная дыспансерызацыя насельніцтва, замацаванне маладых спецыялістаў — гэтыя і іншыя пытанні Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА абмеркавала з кіруючым актывам Лепельскага раёна на пасяджэнні райвыканкама.**





Фота БелТА.

НА парадак дня былі вынесены два пытанні: аб ходзе выканання ў 2022 годзе мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады» і аб выніках работы назіральных камісій Лепельскага раёна за 2022 год і задачах на 2023-і.

Галоўны ўрач Лепельскай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксей Пракоф'еў адзначыў, што па выніках 2022 года з 27 мэтавых паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы на раённым узроўні можна ацаніць 10. З іх па сямі паказчыках дасягнута значэнне, прадугледжанае Дзяржаўнай праграмай на 2022 год.

Так, засваенне запланаваных сродкаў склала 100 працэнтаў — асвоена 19 мільёнаў рублёў. Дэмаграфічная сітуацыя ў раёне характарызуецца скарачэннем насельніцтва і яго старэннем, цяпер тут пражывае звыш 31 тысячы чалавек, а за апошнія тры гады насельніцтва зменшылася на 1273 чалавекі.

Эфектыўнасць перадабортнага кансультавання летась паказала значны станоўчы вынік — ад перапынення цяжарнасці адмовіліся 19 жанчын з 24. Ва ўстанове аховы здароўя праводзіцца абследаванне і накіраванне сужэнцаў, якія пакутуюць ад бясплоддзя, у абласную камісію па пытаннях адной бясплатнай спробы ЭКА ў 2021 годзе з раёна былі накіраваны дзве пары, у 2022-м — адна.

Па стане на 1 студзеня 2023 года ў раёне зарэгістравана 5870 дзяцей. У стацыянары педыятрычнага аддзялення раённай бальніцы ўведзены УГД-скрынінг галаўнога мозга і органаў брушной поласці ў нованароджаных дзяцей, у выніку праведзенай работы за мінулы год першаснае захворванне дзіцячага насельніцтва знізілася на 13,3 працэнта.

«Мы абавязаны зрабіць усё магчымае, каб павысіць прывабнасць мацярынства, палепшыць здароўе, падоўжыць жыццё і папярэдзіць выпадковыя гібелі, — адзначыла Наталля Качанава. — Я часта бываю ў рэгіёнах, дзе абмяркоўваюцца аналагічныя пытанні. Сёння я тут пачула галоўнае: толькі ўсе разам мы можам выправіць сітуацыю да лепшага. Кіраўнікі прадпрыемстваў, грамадскасць, медыкі, педагогі: здароўе нацыі — наша агульная комплексная задача».

У ЦРБ арганізавана работа па правядзенні скрынінгу некаторых відаў раку, выяўленне злаякасных утварэнняў на ранніх стадыях склала практычна 70 працэнтаў. У папярэднія гады зніжэнне гэтага паказчыка было абумоўлена эпідэмічнай сітуацыяй, як вынік — ненаведванне грамадзянамі ўстаноў аховы здароўя і адмова ад скрынінгавых даследаванняў.

Укамплектаванасць урачэбнымі кадрамі ў Лепельскай ЦРБ складае 95 працэнтаў. У 2022 годзе ў раённую бальніцу прыбылі дзевяць маладых спецыялістаў: два ўрачы і сем медыцынскіх работнікаў, замацаванасць кадраў складае 100 працэнтаў. Высокі дасягнуты паказчык абумоўлены стварэннем камфортных умоў: за два апошнія гады кіраўніцтва раёна выдзеліла медыкам 16 арэндных кватэр і 8 месцаў у інтэрнаце.

Старшыня Савета Рэспублікі пацікавілася, ці няма праблем з аказаннем медыцынскай дапамогі грамадзянам у абласных і рэспубліканскіх установах, калі гэтага патрабуе сітуацыя. Кіраўніцтва раёна запэўніла, што ў Лепелі створана свая моцная тэхнічная база і маецца сучаснае абсталяванне для аказання дапамогі на месцы, праблем з пераводам у рэспубліканскія і абласныя клінікі няма.

«Гэта вельмі правільна, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Чалавек павінен мець магчымасць лячыцца ў любой установе нашай краіны незалежна ад месца свайго пражывання».

Аб'ём заробленых пазабюджэтных сродкаў раённай бальніцы за мінулы год склаў 900 тысяч рублёў, планамерна ажыццяўляецца ўмацаванне рэсурснай базы ЦРБ: за 12 месяцаў 2022 года на рамонт аб'ектаў аховы здароўя накіравана 204 тысячы рублёў, закуплена медыцынскае абсталяванне на суму 109 тысяч рублёў.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Супрацоўніцтва моладзі, адзнака найлепшых і размова аб важным

• У Савеце Рэспублікі ў фармаце відэаканферэнцыі адбылася сустрэча Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь з Маладзёжным парламентам пры Сенаце Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан. Беларускі бок на мерапрыемстве прадставілі старшыня Маладзёжнага савета (парламента) Мікіта Рачылоўскі, старшыня камісіі па міжнародных справах Аліна Рацькова і намеснікі старшыні гэтай камісіі Станіслаў Краско і Арцём Мельнік. Маладзёжныя парламентарыі дзвюх краін азнаёміліся са структурамі, асаблівасцямі і архітэктурай кіравання, спецыфікай работы маладзёжных парламентаў і профільных камісій, разгледзелі пытанні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, узаемадзеяння з парламентарыямі і дэпутатамі, задалі адно аднаму пытанні. У ходзе сустрэчы таксама была абмеркавана падрыхтоўка да падпісання пагаднення аб супрацоўніцтве паміж маладзёжнымі парламентамі.

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы узяў удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным 85-годдзю з дня ўтварэння Мінскай вобласці, якое адбылося ў Маладзечне. 15 студзеня 1938 года на першай сесіі Вярхоўнага Савета СССР была прынята Пастанова «Аб змяненні і дапаўненні артыкулаў Канстытуцыі СССР аб увядзенні ў БССР абласнога адміністрацыйнага дзялення», згодна з якой была ўтворана Мінская вобласць. За гэтыя гады Міншчына двойчы ўзнагароджвалася ордэнам Леніна, ёй быў прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Сёння гэта цэнтральны рэгіён нашай краіны з унікальнай гісторыка-культурнай спадчынай і прыродным рэсурсамі, значным прамысловым і сельскагаспадарчым патэнцыялам. Міхаіл Русы пажадаў усім дабрабыту, поспехаў у рабоце, далейшага развіцця і новых дасягненняў. За вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь падчас урачыстай цырымоніі парламентарый уручыў ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу медыцынскім работнікам.

• Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў у рамках адзінага дня інфармавання наведаў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Гімназія № 1 г. Дзяржынска» і сустрэўся з педагагічным калектывам. У сваім выступленні сенатар удзяліў асаблівую ўвагу заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці Савета Рэспублікі ў кантэксце рэалізацыі ўнутранай і знешняй палітыкі ва ўмовах санкцыйнага ціску Захаду. Парламентарый асобна спыніўся на прыярытэтах і асноўных дасягненнях беларускай навукі, а таксама на пытаннях навукова-тэхналагічнай бяспекі. «Для Рэспублікі Беларусь пасяховае развіццё навукі — ключавы элемент гарантавання нацыянальнай бяспекі, — заўважыў Сяргей Рачкоў. — Ва ўмовах сучасных выклікаў, беспрэцэдэнтнага незаконнага ціску Захаду на нашу краіну павышаецца запатрабаванасць навуковых распрацовак, а санкцыйная палітыка ЗША і краін ЕС ператварае гэтыя выклікі ў новыя магчымасці для прарыўных навуковых адкрыццяў і тэхналагічных рашэнняў». Член Прэзідыума Савета Рэспублікі азнаёміўся з арганізацыяй навучальнага і выхаваўчага працэсу ў гімназіі, яе матэрыяльна-тэхнічным аснашчэннем.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «ЮБІЛЕЙНЫ» ЗНАЧЫЦЬ ЭФЕКТЫЎНЫ

## Якія мерапрыемствы запланаваны ў рамках X Форуму рэгіёнаў



Даты правядзення X (юбілейнага) Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ўжо вядомыя: мерапрыемства адбудзецца з 26 да 28 чэрвеня ва Уфе. У Савеце Рэспублікі на чале са **старшынёй Наталляй КАЧАНАВАЙ** адбылося пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Форуму рэгіёнаў, падчас якога ўдзельнікі абмеркавалі кірункі далейшай работы і стратэгіі падрыхтоўкі.

Як адзначыла Наталля Качанава, дадзенае мерапрыемства — вельмі важны складнік ва ўзаемадзеянні Беларусі і Расіі:

— Гэта эфектыўная форма супрацоўніцтва, мы не раз аб тым казалі. Мы павінны адпрацаваць усё дакладна, зладжана, каб не было ніякіх збояў пры правядзенні гэтага важнага мерапрыемства. Плануецца, што ў сакавіку пасяджэнне арганізацыйнага камітэта пройдзе ва Уфе, дзе будзе дэталёва паказана, у якіх месцах будуць працаваць нашы секцыі, дзе будзе праходзіць пленарнае пасяджэнне, якія пытанні будуць разгледжаны.

**Старшыня аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ад беларускага боку, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ** распавёў аб этапах падрыхтоўкі да форуму.

— У рамках форуму запланаваны пасяджэнні секцый — іх сёлета па прапанове расійскага боку будзе дзесяць. Мадэратарамі з беларускага боку будуць старшыні пастаянных камісій, іх намеснікі і члены Савета Рэспублікі. Таксама мы прыцягваем цэлы спіс асоб, якія стануць экспертамі, дакладчыкамі на гэтых секцыях. Акрамя таго, у рамках форуму плануецца правесці чарговае пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве.

Міхаіл Русы падкрэсліў, што адной з галоўных падзей Форуму рэгіёнаў стане сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай і Старшыні Савета Федэрацыі Валянціны Матвіенкі з кіраўнікамі рэгіёнаў, органаў улады і дзяржкіравання Рэспублікі Беларусь і суб'ектаў Расійскай Федэрацыі.

— Традыцыйна сустрэча будзе выкарыстана для прамых кантактаў паміж прадстаўнікамі рэгіёнаў Беларусі і Расіі, цікавасць вельмі высокая. І самае галоўнае — пленарнае пасяджэнне. Нам неабходна будзе абмеркаваць вынікі дзесяці форумаў і перспектывы супрацоўніцтва. На палях форуму таксама пройдзе сумеснае мерапрыемства Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Беларусі і Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі. Акрамя таго, плануецца сумеснае мерапрыемства гандлёва-прамысловых палат. Нам неабходна прапрацаваць пытанне аб правядзенні ва Уфе выставы буйнагабарытнай тэхнікі і ў цэлым дасягненняў народнай гаспадаркі Беларусі. Мы ўдакладнім аб'ём, якія плошчы нам гатовыя выдзеліць, каб Беларусь дастойна выглядала на выставе.

Міхаіл Русы дадаў, што традыцыйна ў рамках форуму плануецца падпісанне пагадненняў і кантрактаў:

— У нас ёсць магчымасць зрабіць усё так, каб форум стаў сапраўды юбілейным, стаў набыткам Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, чарговым крокам у нашых інтэграцыйных сувязях, — рэзюмаваў Міхаіл Русы.

Падводзячы вынікі пасяджэння, Наталля Качанава адзначыла, што Расійская Федэрацыя па-ранейшаму застаецца нашым стратэгічным партнёрам:

— Тыя пытанні, якія сёння даводзіцца вырашаць Расіі і Беларусі, — сугучныя. У рамках санкцыйнага ціску нашы краіны сталі бліжэйшыя ў супрацоўніцтве. Прынятае дзесяць гадоў таму рашэнне аб правядзенні Форуму рэгіёнаў паказвае сваю эфектыўнасць і сёння. Кіраўнік нашай дзяржавы дакладна абазначыў, што галоўнае пытанне ў інтэграцыі — гэта эканоміка. І, несумненна, асноўным складнікам у правядзенні нашага мерапрыемства з'яўляецца падпісанне кантрактаў і пагадненняў. Летась было падпісана кантрактаў і пагадненняў на 65 млрд расійскіх рублёў, або 2,5 млрд беларускіх. Мы разлічваем, што сёлета будзе падпісана не менш. Яшчэ раз хачу адзначыць, што правядзенне Форуму рэгіёнаў — вяршыня той работы, якая праходзіць на працягу ўсяго года.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што сёлета пашырыцца колькасць тэматычных пляцовак форуму:

— Летась было шэсць секцый, на якіх разглядаліся актуальныя пытанні нашага супрацоўніцтва, сёлета плануецца дзесяць. На мой погляд, вельмі цікавая тэматыка выбрана ў рабоце секцый. Будуць агучаны пытанні, якія сёння актуальныя: гэта стварэнне сумесных прадпрыемстваў і вытворчасцяў, выпуск імпартазамяшчальнай прадукцыі. Наша супрацоўніцтва пашыраецца абсалютна па ўсіх напрамках, — рэзюмавала Наталля Качанава.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# НА МЕСЦАХ — ПАРАДАК, ДА ЛЮДЗЕЙ — ПАВАГА

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Асаблівую ўвагу Наталля Іванаўна звярнула на праблему алкагалізацыі насельніцтва раёна: на дыспансерным уліку стаяць 614 пацыентаў, на назіранні ўрача-нарколага — звыш 750. «Важна, каб над вырашэннем гэтай праблемы працавалі не толькі ўрачы, але і былі задзейнічаны ўсе суб'екты прафілактыкі, грамадства. Гэта ўсе нашы людзі, мы не маем права адкідаць каго-небудзь. Толькі ўзяўшыся за справу разам, мы можам дасягнуць добрага выніку», — сказала Наталля Качанава.

Аб рабоце назіральных камісій на Лепельшчыне далажыў намеснік старшыні райвыканкама Віктар Азаронак. На сённяшні дзень у раёне сфарміравана 10 назіральных камісій, якія за мінулы год наведалі звыш 3500 домаўладанняў.

Летась здарылася 36 пажараў, на якіх загінулі два чалавекі. З мэтай прывядзення домаўладанняў у пажаранебяспечны стан была аказана адрасная сацыяльная дапамога больш як 40 грамадзянам: гэта рамонт печаў, замена газавага абсталявання, рамонт электраправодкі. За два гады прафсаюзныя арганізацыі прадпрыемстваў раёна набылі і ўсталявалі звыш 300 аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў сваім работнікам, якія выйшлі на пенсію.

З мэтай папярэджання гібелі людзей на вадзе ў сакавіку 2022 года ў Лепелі пачала дзейнічаць выратавальная станцыя, і ўжо бачная станоўчая дынаміка: у 2021 годзе на вадзе загінулі пяць чалавек, у мінулым — адзін.

Падводзячы вынік сустрэчы з актывам Лепельскага раёна, Наталля Качанава адзначыла, што ў Беларусі для людзей робіцца максімум магчымага. «Прымаем дзейсныя законы, выдаткоўваем фінансаванне, працуем па ўсіх кірунках. Нягледзячы на санкцыі, паспяхова функцыянуе эканоміка, нарошчваем уласны выпуск лекаў і іншай прадукцыі, павышаем пенсіі, зарплаты, шчыльна займаемся пытаннямі працаўладкавання — шмат у чым наша стратэгія работы з людзьмі беспрэцэдэнтная. Але часам зачыненымі дзвярыма ў кабінет адзін чыноўнік можа ўсе гэтыя намаганні звесці ні нішто — чалавек перастае давяраць уладзе. Так быць не павінна».

Тэма шчыльнага ўзаемадзеяння кіраўнікоў усіх узроўняў з людзьмі і абмеркаванне пытанняў дэмаграфічнай бяспекі працягнуліся пазней на Лепельскім хлебазаводзе. Наталля Іванаўна пабывала ў цэхах, азнаёмілася з вытворчасцю і ў сяброўскай абстаноўцы пагутарыла з рабочымі.

Адной з тэм для размовы з працоўным калектывам хлебазавода сталі традыцыйныя каштоўнасці: сям'я, павага да старэйшых і гістарычная мінулага. Наталля Качанава падкрэсліла: беларускі народ, які ў мінулым не раз адчуў на сабе нягоды вайны і пасляваеннага перыяду, безумоўна, цэніць мір. А краіна, якая паважае традыцыі, гісторыю, людзей і сваю незалежнасць, абавязкова будзе развівацца.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ І ПРЫМЯНЕННЕ ВЕДАЎ НА ПРАКТЫЦЫ

## Таццяна Рунец правяла сустрэчу з членамі Маладзёжнага парламента, якія займаюцца эканомікай

**Старшыня камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец правяла сустрэчу з членамі Маладзёжнага парламента па эканоміцы, інавацыйным развіцці і прадпрымальніцтве. Падчас дыялогу з сенатарам удзельнікі сустрэчы задалі пытанні, якія іх цікавяць. Сярод іх — падатковая сістэма, паспяховае будаўніцтва і развіццё прадпрыемстваў. У сваю чаргу, Таццяна Рунец распавяла аб асноўных напрамках работы камісіі.**



Фота sovrep.gov.by.

— У вашым узросце вы маеце ўнікальную магчымасць даведацца аб рабоце органаў улады, — звярнулася да членаў Маладзёжнага парламента Таццяна Рунец. — Радуе тое, што моладзь ведае, што такое заканадаўчая галіна ўлады. Бо, на жаль, часам дарослыя людзі, з якімі мы сустракаемся ў калектывах, не зусім разумеюць, што такое заканадаўчыя органы. Наша камісія разглядае ўсе пытанні, звязаныя з бюджэтам, падаткамі, банкамі, страхаваннем, абаронай правоў спажыўцоў. Акрамя таго, мы займаемся падрыхтоўкай вельмі важных законаў. Напрыклад, закон аб ліцэнзаванні, які прыводзіць работу прыватных школ у адпаведнасць з заканадаўствам. Таксама закон аб вырашэнні неплацежаздольнасці, згодна з ім банкруцтва — не прысуд, галоўнае — своечасова яго распазнаць і прыняць меры па санацыі.

— Вядома, любая ваша дапамога — вялікая падтрымка для нашай камісіі. Таму калі ў вас з'яўляюцца ідэі і прапановы, абавязкова дзяліцеся імі, — звярнулася яна да маладых людзей.

Удзельнікамі сустрэчы сталі маладыя спецыялісты, некаторыя з іх ужо займаюць кіруючыя пасады на прадпрыемствах. Як распавёў **старшыня камісіі Маладзёжнага парламента па пытаннях эканомікі, інавацыйным развіцці і прадпрымальніцтве Ігар КАРНЮШКА**, сустрэча са старэйшымі калегамі адбываецца на пастаяннай аснове:

— Вельмі прыемна, што яны, нягледзячы на шчыльны графік, знаходзяць магчымасць сустракацца з намі. Гэта чарговы раз пацвярджае, што нашым старэйшым калегам важна пачуць нашы меркаванні і пазіцыю. Пастаянны кантакт вельмі важны як для нас, так і, думаю, для іх.

Ігар Карнюшка дадаў, што ў рамках камісіі па пытаннях эканомікі, інавацыйным развіцці і прадпрымальніцтве рэалізоўваецца шмат праектаў:

— У склад нашай камісіі ўваходзіць адзінаццаць маладых людзей, якія ў сваіх раёнах ажыццяўляюць праекты, напрыклад, «Школа актыўнага грамадзяніна». Таксама пры ўніверсітэтах у нас ёсць інкубатар малога бізнесу. Інавацыйнае развіццё як ніколі актуальнае. Тыя інавацыі, якія мы імкнёмся ўкараняць, паспрыяюць развіццю не толькі нашых прадпрыемстваў, але будуць карысныя і бізнесменам, а таксама ў цэлым сістэме аховы здароўя, адукацыі і культуры.

Члены Маладзёжнага парламента адзначылі, што такія сустрэчы дазваляюць папоўніць запас ведаў і вопыту, а дыялог са старэйшымі калегамі — добрая магчымасць атрымаць экспертныя адказы на пастаўленыя пытанні. Пачутыя парады знаходзяць ужытак: на сваіх працоўных месцах маладыя спецыялісты прымяняюць веды на практыцы.

**Арына КАРПОВІЧ.**

БЛІЗКАЯ УЛАДА

# На першым месцы — бяспека

## Сенатар разбіралася ў сітуацыі, дзе варта ўлічыць нормы заканадаўства і пажаданні заяўніка

**На асабісты прыём грамадзян да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяны РУНЕЦ звярнуўся мінчанін, які сутыкнуўся з праблемай установкі газавага катла. Мужчына жыве ў старым доме ў гістарычнай частцы сталіцы — Асмалоўцы, дзе некаторыя двухпавярховікі ацяпляюцца газавымі катламі, з іх дапамогай адбываецца і падагрэў вады. Але замяніць старое абсталяванне, якое адпрацавала свой рэсурс, на новае аказалася не такой простай задачай. Што рабіць, калі пажаданні грамадзяніна не супадаюць з нормамі заканадаўства? Сенатар вырашыла разабрацца не толькі з праблемай заяўніка, але і прааналізаваць дзеючае заканадаўства: ці ўлічаны ў новых нормах патрэбы жыхароў аналагічных дамоў. Для абмеркавання сітуацыі ў Савет Рэспублікі былі запрошаны намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр БАЛАШЭНКА, кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна сталіцы Мікалай ПАЛЯКОЎ, кіраўніцтва НДІ Белгіпратопгаз, УП «Мінгаз», ЖКХ Цэнтральнага раёна Мінска і ўласна сам заяўнік.**

На тэрыторыі Асмалоўкі 26 двухпавярховых дамоў, каля 16 з іх ацяпляюцца з дапамогай газавых калонак. Дамы пабудаваны ў пачатку пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя і адносяцца да ахоўнай зоны, якая прыраўноўваецца да архітэктурнай каштоўнасці. Згодна з прынятым рашэннем, да 2030 года іх знос не плануецца. Як адзначыў **дырэктар КУП ЖКХ Цэнтральнага раёна Мінска Аляксей Собаль,** капітальны рамонт гэтага жыллёвага фонду таксама немэтазгодны. Пры гэтым калі ў жыхароў узнікаюць пытанні, звязаныя з эксплуатацыяй дома, яны аператыўна вырашаюцца.

Газавы кацёл у кватэры заяўніка быў размешчаны ў ванным пакоі. Ён адпрацаваў свой рэсурс і патрабуе замены. Заяўнік набыў новы двухконтурны кацёл. Аднак, згодна з нормамі 2019 года, устаноўка газавага абсталявання ў санвузлах забараняецца. Мінчанін жа катэгарычна адмаўляецца ўстанаўліваць яго ў іншым месцы кватэры.

Як высветлілася, заяўнік ужо неаднойчы сустракаўся з прадстаўнікамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, праектных арганізацый. І яго пажаданні ідуць уразрэз з нормамі бяспекі. Падчас такіх сустрэч выявіліся і іншыя праблемы, у прыватнасці з дымаходам, які таксама не адпавядае патрабаванням сучаснага газавага абсталявання, і вентыляцыйнымі каналамі. Не так проста аказалася і падключыць новы кацёл да электрычнасці.

— Стары кацёл не патрабаваў падводу электрычнасці. Калі б заяўнік купіў кацёл той жа магутнасці, які быў устаноўлены раней, ён бы ўсталяваў яго там, дзе і знаходзіўся стары — у ванным пакоі, нормы гэтага не забараняюць. Новы патрабуе электрычнасці. Для яго ўстаноўкі неабходна правесці ўвесь комплекс работ, у тым ліку па электрыцы. Для гэтага спачатку патрабуецца праект, — каментуе кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Мікалай Палякоў.

Нягледзячы на тое што пажаданні заяўніка не адпавядаюць дзеючым нормам і патрабаванням бяспекі, прадстаўнікі праектнай арганізацыі, газавай гаспадаркі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва яшчэ раз наведаюць яго кватэру. На месцы сітуацыю прааналізуюць: як зрабіць так, каб устаноўка новага газавага абсталявання была бяспечнай і максімальна адпавядала пажаданням заяўніка.

— Па меркаванні грамадзяніна, будаўнічыя нормы, уведзеныя з 2019 года, не ўлічваюць асаблівасцяў двухпавярховых жылых дамоў, размешчаных у раёне Асмалоўка, якія маюць газавае ацяпленне. Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва сцвярджае, што ўсё ўлічана і пры ўстаноўцы катлоў магчыма часам адыходзіць ад існуючых правіл. Таму варта разабрацца, і мы запрасілі праектную арганізацыю, Дзяржатамнагляд, распрацоўшчыкаў пастанаўлення, каб на месцы, у кватэры грамадзяніна, яшчэ раз усё паглядзець. Варта ўлічваць, што і нормы распрацаваны не проста так, правілы бяспекі мусяць быць захаваны, — каментуе Таццяна Рунец. — Нельга адназначна сказаць, што сітуацыя вырашыцца на карысць грамадзяніна. Будзе дазволена толькі бяспечная ўстаноўка газавага катла.

Сенатар дадала, што зварот жыхара Асмалоўкі, магчыма, будзе не адзінкавым — старое абсталяванне паступова адпрацоўвае свой рэсурс і патрабуе замены. Не выключана, што спатрэбяцца і змены ў заканадаўстве.

— Калі такія змяненні ў заканадаўстве патрабуюцца, то мы, вырашыўшы дадзеную сітуацыю, будзем ініцыяваць іх, каб надалей і грамадзянам, і арганізацыям, і праекціроўшчыкам, якія будуць з гэтым сутыкацца, можна было дзейнічаць без парушэнняў нормаў, — падкрэсліла Таццяна Рунец.

**Алена КРАВЕЦ.**

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# ЭНЕРГЕТЫКА НЯСТОМНАЙ ДУШЫ

## У Гомельскім раёне ветэраны працы падзяліліся вопытам работы з моладдзю

**Выклікаюць на ўзгадненне пасады, характарызуюць, а пасля: «Ёсць у яго адзін недахоп — вельмі перажывае за людзей...» Цікавыя факты з біяграфіі, парады, як працаваць камандай, а клопат ці праблему чалавека ў калектыве ўспрымаць нібы сваю асабістую — незвычайную гасцёўню «Будучыня Беларусі — у адзінстве. Сустрэча пакаленняў» арганізавалі ў Гомельскім раёне. Яе ўдзельнікамі сталі члены Савета старэйшын пры райвыканкаме і маладзёжных Саветаў райсавета дэпутатаў і раённага аб'яднання прафсаюзаў.**

### «Калектыў папрасіў, я пайшла...»

Ганаровыя госці, а ў мінулым — актыўныя, адказныя, небаязлівыя работнікі, якія займалі розныя пасады ў арганізацыях раёна і ўнеслі неацэнны ўклад у яго развіццё. Так вядучыя сустрэчы прадставілі актывістаў Савета старэйшын. Кожны з гасцей мог падзяліцца павучальнымі гісторыямі з жыцця і работы, адказаць на пытанні моладзі раёна.

Былы кіраўнік Яромінскага сельвыканкама Галіна Ганчарова, а некалі — у свае няпоўныя 20 гадоў — камсамолка-актывістка, умела арганізаваць людзей на любую карысную справу.

— Пачынала з вучаніцы ў ткацкім цэху. І ўжо праз гадоў 6-7 — старшыня мясцкама, тады такую пасаду ў нас толькі-толькі адкрывалі. Мяне калектыў папрасіў, я пайшла, — падзялілася з маладым пакаленнем член Савета старэйшын райвыканкама.

Галіна Ізотаўна тлумачыць сутнасць пасады «старшыня мясцкама» — важнай для арганізацыі работы на мясцовым узроўні, аб якой прысутныя маладыя людзі, як прызнаюцца, і не чулі дагэтуль.

У 25 гадоў стала старшынёй Шарпілаўскага сельвыканкама Марыя Зубарава.

— Пачынаць прыйшлося з таго, каб увесці нумарацыю дамоў і наогул рэгламентаваць вуліцы, бо мясцовыя жыхары не маглі толкам перадаць, па якім адрасе жывуць, называлі вулічныя «мянушкі», — прызналася Марыя Іванаўна, якая пасля шмат гадоў адпрацавала старшынёй Чонкаўскага сельвыканкама, супрацоўніцай райвыканкама.

### Учарашнія школьнікі — будучыя кіраўнікі

Многія актывісты маладзёжных Саветаў здзіўляліся фактам з біяграфіі, аб якіх распавялі і іншыя запрошаныя ганаровыя госці са старэйшага пакалення: маўляў, так не можа быць.

— У 18 гадоў прыйшла працаваць бухгалтарам у гаспадарку, а засталася на адным прадпрыемстве на 52 гады, — выклікаў апладысменты расказ Любові Казловай: яна больш за паўвека працавала ў КСУП «Брылёва».

— Што часцей за ўсё ўспамінаецца — калі пачыналі проста рахункаводам, працавалі бухгалтарам, у тым ліку і галоўным, або калі 16 апошніх гадоў неслі адказнасць за людзей, клімат у працоўным калектыве? — адрасавалі пытанне Любові Фёдараўне госці сустрэчы, цікавячыся яе сакрэтам поспеху і вернасці прадпрыемству.

— Працаваць з людзьмі і для людзей, — дала жанчына параду маладым людзям, якія цяпер прадстаўляюць органы мясцовага кіравання і самакіравання ў раёне. — Не лічыла ніколі, што толькі работа ў гаспадарцы — мой клопат, праблемы ці набалелае пытанне ў нашай сельскай школе, паліклініцы, садку — гэта таксама ўсё маё.

Яшчэ адзін госць сустрэчы — Дзмітрый Макушэнка — у свой час стаў самым маладым кіраўніком сельгаспрадпрыемства ў краіне: стаў дырэктарам будучай эксперыментальнай базы «Гомельская» ў 28 гадоў. Пасля працаваць давялося і начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі, першым намеснікам старшыні райвыканкама.



— Хацеў стаць хірургам, а ў апошні момант перадумаў і падаў дакументы ў сельскагаспадарчую акадэмію. Памятаю як цяпер,



конкурс, калі паступаў, быў чатыры чалавекі на месца. Выкладчыкі ў нас, лічу, былі самыя лепшыя, — расказаў аб сабе Дзмітрый Мікалаевіч. — Калі атрымаў дыплом, трапіў на першае месца работы аграномам у гаспадарку ў Брэсцкай вобласці. Прыйшоў, а ў калектыве сярэдні ўзрост работнікаў — 45 гадоў. Спачатку глядзелі на мяне дапытліва: «што за дзіця прыйшло да нас»...

### Задача — здаровыя цела і дух

Як праз лёс канкрэтнага чалавека можна прасачыць гісторыю станаўлення раёна і вобласці ў цэлым, моладзь зразумела падчас выступлення Васіля Скачкова. Васіль Міхайлавіч з 1974 да 2004 года быў галоўным урачом Гомельскага раёна. Пад яго кіраўніцтвам пабудаваныя і пачалі працаваць раённыя паліклініка і бальніца, больш за дваццаць урачэбных амбулаторый і без нечага тры дзясяткі фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Гэты чалавек клапаціўся і аб узвядзенні жылля для медработнікаў.

— Працоўны стаж — 63 гады, з якіх 52 гады ў Гомельскім раёне, — сціпла дадае спадар Скачкоў, дарэчы, дэлегат І з'езда ўрачоў, І Усебеларускага народнага сходу. І ўжо не так сціпла, як гаварыў аб сабе, а вельмі эмацыянальна звяртаецца да моладзі раёна: «Займайцеся спортам, рухайцеся, адмоўцеся ад шкодных звычак, ведайце, што самае каштоўнае — здароўе нацыі, здаровыя будучыя пакаленні».

Таксама госці падзяліліся сваім шматгадовым вопытам работы ва ўстановах адукацыі, у сацыяльнай службе, раённым фінансавым аддзеле.

### У новым фармаце

— Такія сустрэчы важныя і патрэбныя для нас. Сёння маладым неабходныя жывы дыялог з прадстаўнікамі старэйшага пакалення, усведамленне таго, што мы — вашы пераемнікі і нясём адказнасць за краіну, за захаванне гістарычнай праўды і духоўных каштоўнасцяў, — падзякаваў членам Савета старэйшын пры райвыканкаме ўдзельнік сустрэчы — **старшыня камісіі па рэгіянальнай палітыцы і ўзаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Станіслаў СЯМЁНАЎ.**

Фармат дыялогу дазволіў кожнаму выказаць сваё меркаванне і быць пачутым, звярнула ўвагу арганізатар сустрэчы, **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКАЯ:**

— Такое маштабнае мерапрыемства з прадстаўнікамі розных пакаленняў арганізавана ўпершыню ў раёне, і падобную практыку мы абавязкова працягнем, — падкрэсліла яна.

Старшыня райсавета дэпутатаў перакананая, што лепш за ўсё расказаць моладзі аб гісторыі рэгіёна, развіцці розных галін эканомікі змогуць менавіта людзі працы, ветэраны.

— Указам Прэзідэнта бягучы год аб'яўлены Годам міру і стварэння. Сімвалічна, што мы пачынаем гэты год першым мерапрыемствам у раёне «Будучыня Беларусі — у адзінстве. Сустрэча пакаленняў», прысвечаным 85-годдзю ўтварэння Гомельскай вобласці, — адзначыла **старшыня Гомельскай раённай арганізацыі прафсаюзаў Ларыса ЛЕГЛІК.** — Гісторыя краіны, вобласці і раёна ва ўспамінах, гістарычных фактах, лёсавызначальных рашэннях канкрэтных людзей лёгка ўспрымаецца і запамінаецца моладдзю на ўсё жыццё.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

# КАБ ВЁСКІ НЕ «СІРАЦЕЛІ»

## Як у Старадарожскім раёне вырашаюць праблему пустых дамоў

**Чым толькі не даводзіцца займацца старшыні райсавета. І няўладкаванымі сем'ямі, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, і асобамі, што вядуць асацыяльны спосаб жыцця, злоўжываюць алкаголем, і пошукам работы для тых, хто не вельмі імкнецца працаваць, і добраўпарадкаваннем тэрыторый, навядзеннем парадку на зямлі ды шмат якімі іншымі пытаннямі. Але старшыня Старадарожскага раённага Савета дэпутатаў Дзмітрый Давыдаў знайшоў час, каб сустрэцца з карэспандэнтам «Мясцовага самакіравання».**



Пакуль ехалі да будынка райвыканкама, я ўважліва глядзела па баках. За вокнамі машыны праплывалі дагледжаныя вуліцы, адміністрацыйныя будынкі, прыгожа агароджаныя прыватныя дамы, падворкі з малымі архітэктурнымі формамі, дэкаратыўнымі кустамі.

— Так, добраўпарадкаванню райцэнтра, навядзенню парадку на зямлі мы ўдзяляем значную ўвагу, — перахапіў мой позірк Дзмітрый Міхайлавіч. — Не выключэнне і сельская мясцовасць. Сур'ёзна ўзяліся за пустыя і старыя дамы. Пагадзіцеся, пабудовы з праваленымі дахамі, дзіркамі замест вокнаў не толькі псуюць вонкавы выгляд населенага пункта, але і ствараюць пагрозу для дапытлівых дзяцей, якія любяць пагуляць у партызанаў. А пасля зносу нежылых пабудоў расчышчаныя ўчасткі можна ўжыць з карысцю, увесці ў грамадскі севазварот, засеяць сельскагаспадарчымі культурамі або аддаць пад новую жылую пабудову, прадаць насельніцтву.

Нашу размову перапыняюць частыя тэлефонныя званкі. Нехта просіць старшыню пасадзейнічаць у расчыстцы дарогі, каб аўтакрама своечасова прыйшла ў вёску. Дзмітрый Міхайлавіч адразу ж тэлефануе спецыялістам адпаведных службаў, каб тыя не марудзілі, выехалі на месца са спецтэхнікай. А некаму спатрэбілася кансультацыя, як набыць «асірацелы» дом у вёсцы. Дзмітрый Міхайлавіч не адмаўляе ў просьбе і дадае, што ўся неабходная інфармацыя змешчана на сайце райвыканкама, пастаянна друкуецца ў раённай газеце.

> «Пагадзіцеся, пабудовы з праваленымі дахамі, дзіркамі замест вокнаў не толькі псуюць знешні выгляд населенага пункта, але і ствараюць пагрозу для дапытлівых дзяцей, якія любяць пагуляць у партызаны».

— Сапраўды, мы імкнёмся стымуляваць продаж дамоў у апусцелых вёсках, дзе засталося некалькі састарэлых жыхароў, даць другое дыханне гэтым населеным пунктам. І многія сядзібы набылі новых гаспадароў, сталі самабытнымі куточкамі малой радзімы, крыніцамі новага жыцця на карце раёна, — канстатуе Дзмітрый Давыдаў.

На тэрыторыі Старадарожскага раёна налічваецца 90 населеных пунктаў. Штогод камісія аб'язджае кожны з іх і выяўляе «нічыйныя» дамы. На 1 студзеня 2022 года такіх было 200, у тым ліку 165 пустых і 35 старых. На 1 снежня іх засталося 142, 134 «асірацелыя» і 8 непрыдатных для жыцця..

— Безумоўна, мы працуем з людзьмі, знаходзім тых, каму належыць маёмасць, шлём ім адпаведнае паведамленне. Такія пісьмы накіравалі кожнаму ўласніку з просьбай растлумачыць, што ён будзе рабіць з маёмасцю. Атрымалі 49 адказаў, што людзі будуць яе выкарыстоўваць. Калі чалавек адмаўляецца ад спадчыны, то пасля адпаведнай працэдуры дом пераходзіць на карысць сельвыканкама, які прымае рашэнне прадаць пабудову або знесці. Мы прадалі 17 такіх дамоў. Купляюць гараджане, мясцовыя жыхары, мінчане. Нехта — пад дачу, а хтосьці — для пастаяннага жыцця, — адзначае суразмоўнік. — Калі на дом прэтэндуе адзін чалавек, прадаём за адну базавую велічыню — 32 рублі. Калі ахвотных набыць яго некалькі, выставім на аўкцыён. Лічу, што гэта ўнікальная магчымасць атрымаць невялікі домік у вёсцы амаль што задарма.

У 2022-м з раённага бюджэту было выдзелена на знос дамоў 70 тысяч рублёў, знеслі 53 дамы.



Праз тры-чатыры гады ў Старадарожскім раёне не будзе праблемы старых дамоў, упэўнены старшыня.

— І абавязковая ўмова: не проста «ліквідаваць» пабудову. Калі яна прымыкае да поля, мы ўводзім зямельны ўчастак у севазварот. Вынік 2021-га — каля 74 гектараў, летась таксама столькі ж. Імкнёмся рацыянальна выкарыстоўваць і будаўнічыя матэрыялы, яны не выкідваюцца на сметнік. Напрыклад, пры ўмове, што дом драўляны, яго рэшткі ўжываюцца для ацяплення грамадскай лазні. Летам дровы аддаюцца сельсарганізацыі для зернесушылак. Зрэшты, вынікі нашай агульнай работы вы ўбачыце самі...

> «Мы імкнёмся стымуляваць продаж дамоў у апусцелых вёсках, дзе засталося некалькі састарэлых жыхароў, даць другое дыханне гэтым населеным пунктам. І многія сядзібы набылі новых гаспадароў, сталі самабытнымі куточкамі малой радзімы, кропкамі новага жыцця на карце раёна».

Дзмітрый Міхайлавіч запрашае мяне на экскурсію па Дражнаўскім сельсавеце. Там нас чакае старшыня сельвыканкама Ніна Патоцкая. Далей наш шлях ляжыць у вёску Залужжа. На ўездзе ў аграгарадок уладкаваны знак з выявай сэрца і надпісам «Я люблю Залужжа».

— У цёмныя часы сутак ён падсвечваецца і бачны здалёк. Вельмі прыгожа, — кажа Ніна Уладзіміраўна.

Спыняемся каля невялікага манумента, які адкрыты ў 1969 годзе ў памяць аб 180 земляках, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Помнік уяўляе сабой скульптуру воіна, які трымае на руках дзіця, і сцяну з імёнамі тых, хто загінуў за свабоду, прапаў без вестак.

У 1989-м помнік быў рэканструяваны. А нядаўна манумент абнавілі, уладкавалі падсветку, тлумачыць Дзмітрый Давыдаў.

А вось і мясцовыя могілкі. Акуратна прыбраныя, агароджаныя.

— Асаблівы акцэнт мы робім на добраўпарадкаванне пагостаў, прыцягваем да ўдзелу ў грамадска карыснай справе насельніцтва, ладзім так званыя санітарныя дні, — кажа Ніна Патоцкая. Праз два аграгарадкі праходзіць рэспубліканская траса, праязджаюць госці, людзі з іншых мясцовасцяў. Нельга дапусціць, каб яны думалі, што мы дрэнныя гаспадары. Праводзім тлумачальную работу з жыхарамі, каб домікі, участкі, падворкі былі ў належным стане, дагледжаныя. Пацiху набіраем абароты, людзі нас разумеюць, ідуць насустрач.

— У мінулым годзе санітарныя дні з удзелам жыхароў адбыліся ў кожным сельсавеце, — дадае Дзмітрый Міхайлавіч. — Такім чынам прывучаем людзей наводзіць парадак на могілках, магілах сваіх родных, блізкіх. Пакуль могілкі на балансе сельсаветаў, але хутка будуць перададзены на абслугоўванне спецыялізаванай арганізацыі — «Старадарожская жыллёва-камунальная гаспадарка».

Праязджаем каля невялікага доміка, побач з якім зямельны ўчастак даволі ўнушальных памераў.

— Гэтая тэрыторыя была скрозь зарослая хмызняком. Жыхар са Старых Дарог купіў хату, навёў парадак, — тлумачыць Ніна Патоцкая. — Мы прадалі сем жылых будынкаў за адну базавую, на падыходзе — яшчэ тры.

Непрыкметна пад'язджаем да вёскі Ляды. Тут пастаянна жывуць тры чалавекі, а 15 дамоў выкарыстоўваюцца пад дачы.

— Летам у нас ажываюць вёскі. Для многіх гэта малая радзіма, дзеці вяртаюцца ў бацькоўскае гняздо. Тут набываюць маёмасць тыя, хто любіць цішыню, прыроду. Вёску атачае лес, непадалёку возера Скачальскае. А хто хоча камфорту, даброт цывілізацыі, купляюць маёмасць у аграгарадку Залужжа, дзе падведзены вадаправод, прыродны газ, — сцвярджае Ніна Патоцкая.— Яшчэ нядаўна вёска выглядала закінутай. Літаральна за два гады тут навялі адмысловы парадак, знеслі непатрэбныя дамы, расчысцілі ўчасткі, увялі іх у грамадскі севазварот.

Так, у набытую маёмасць трэба ўкласці шмат сродкаў, але матэрыяльныя затраты людзей не стрымліваюць. Акрамя таго, што ў сельсавеце прадалі нямала дамоў, восем знеслі. Дапамагае ў гэтым насельніцтва, ажыццяўляе знос самастойна, за свае сродкі. У рэестры пустых на сёння 26 дамоў, у 2021-м было 39.

— Працуем планава, сістэмна. І калі будзем прыводзіць у парадак па адной вёсцы, то хутка атрымаем добры вынік, — лічыць старшыня сельвыканкама.

Вяртаемся назад знаёмым шляхам. Змяркаецца, Залужжа ззяе ліхтарамі — жыве вёска.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 12.768. Нумар падпісаны ў 19.30 24 студзеня 2023 года.

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «МинскСортСемОвощ»

*(220014, г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1)*

***по решению наблюдательного совета Общества***

**СОСТОИТСЯ В ОЧНОЙ ФОРМЕ 03 февраля 2023 года**

**Повестка дня собрания:**

1. Приобретение ОАО «МинскСортСемОвощ» акций ОАО «МинскСортСемОвощ».
2. Внесение изменений в Устав ОАО «МинскСортСемОвощ».

**Место проведения собрания:** г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1 (актовый зал).

**Начало собрания:** 09.00.

Время регистрации участников – в день проведения собрания с 08.30 до 08.55 по месту проведения собрания.

Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания – с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 30 января 2023 года, по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.

Прием предложений в повестку дня – с 24 января 2023 года по 27 января 2023 года.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра по состоянию на 26 января 2023 года.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

***Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ»***

УНП 600052664

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества**

## ООО «ИЗОСПАН»

(УНП 812000699, г. Минск, ул. Мельникайте, д. 2, оф. 2001 (помещение 1)),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов:* 09 февраля 2023 года.**

Начало – 12.00. Заявки принимаются с 25 января 2023 года по 07 февраля 2023 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интернет-сайте http://bankrot.gov.by и http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 174 (29796) за 06.09.2022, РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 184 (29806) за 20.09.2022. РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 221 (29843) за 10.11.2022. РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 257 (29879) за 30.12.2022

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества**

## ООО «ИЗОСПАН»

(УНП 812000699, г. Минск, ул. Мельникайте, д. 2, оф. 2001 (помещение 1)),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов:* 09 февраля 2023 года.**

Начало – 10.00. Заявки принимаются с 25 января 2023 года по 07 февраля 2023 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «ИЗОСПАН» (УНП 812000699)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интернет-сайте http://bankrot.gov.by и http://www.specrealization.by. Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 215 (29837) за 02.11.2022.

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»

**13 февраля 2023 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 40 %, без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Автомобиль «GAZ-5201», тип ТС – грузовой специальный, цистерна, номер кузова (vin) 0906663, цвет – голубой, год выпуска – 1986, инвентарный № 2101 | 2940,00 | 294,00 |
| Лот 2 | Автомобиль «ZIL-431412», тип ТС – грузовой специальный, цистерна, номер кузова (vin) XTZ431412R3392697, цвет – белый, год выпуска – 1994, инвентарный № 2039 | 3780,00 | 378,00 |
| Лот 3 | Автомобиль «MAZ 5337», тип ТС - грузовой специальный, машина дорожная комбинированная, номер кузова (vin) Y3M533700Y0037768, цвет – белый, год выпуска – 2000, инвентарный № 1967 | 6000,00 | 600,00 |
| Лот 4 | Трактор бульдозер Б 10М, заводской номер машины – 40920, год выпуска – 2008, инвентарный номер 4090 | 18120,00 | 1812,00 |
| Лот 5 | Каток «Амкодор» 6223А, заводской (серийный, идентификационный) номер – 0506003, год выпуска – 2006, инвентарный номер 4030 | 12240,00 | 1224,00 |
| Лот 6 | Автогрейдер ГС-14.02, заводской номер – 070090, год выпуска – 2007, инвентарный номер 1415 | 38760,00 | 3876,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 (0222)0712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **13 февраля 2023 года в 11.00** по адресу: г. Могилёв, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Местонахождение имущества: г. Могилёв, Славгородский проезд, 17.
4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **07.02.2023 г.**, время: **17.00.**
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и представления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
10. Ссылка на ранее опубликованные извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3»: в газете «Звязда» от 09.07.2022, 12.10.2022, 06.12.2022, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»

**14 февраля 2023 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 40 %, без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Полуприцеп (установка для регенерации асфальтобетона) ПМ-107, 2010 года выпуска, заводской номер 453, регистрационный знак ТВ-6 3128, инвентарный номер 1951 | 4560,00 | 456,00 |
| Лот № 5 | Погрузчик фронтального ТО-18Б, 1998 года выпуска, заводской номер 198153, регистрационный знак ТА 0547, инвентарный номер 1253 | 9720,00 | 972,00 |
| Лот № 6 | Автогрейдер «ГС-14.02», год выпуска 2008, заводской номер 080398, регистрационный знак – IB-6 4265, инвентарный номер 868 | 26280,00 | 2628,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **14 февраля 2023 года в 11.00** по адресу: г. Могилёв, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Местонахождение имущества: г. Могилёв, Славгородский проезд, 17.
4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **08.02.2023 г.**, время: **17.00.**
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и представления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
10. Ссылка на ранее опубликованные извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3»: в газете «Звязда» от 17.05.2022, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»

**15 февраля 2023 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 20 %, без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Трактор К-701, заводской номер 8702588, год выпуска – 1987, регистрационный знак ТВ-6 9978, инвентарный номер 873 | 12960,00 | 1296,00 |
| Лот № 2 | Автогрейдер ДЗ-98 В 7.2, заводской номер 3150СП, год выпуска – 2001, регистрационный знак 9188 БЮ, инвентарный номер 383 | 26720,00 | 2672,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **15 февраля 2023 года в 11.00** по адресу: г. Могилёв, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Местонахождение имущества: г. Могилёв, Славгородский проезд, 17.
4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **09.02.2023 г.**, время: **17.00.**
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и представления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
10. Ссылка на ранее опубликованное извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» – в газете «Звязда» 06.12.2022, а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»

**09 февраля 2023 года в 11.00** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Стоимость с учетом снижения на 40 %, без НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот 1 | Автомобиль «VAZ-21150», тип ТС – легковой специальный седан (SEDAN), номер кузова (vin) XTA21150033475295, цвет – серебристо-желто-зеленый, год выпуска – 2003, регистрационный знак 5540 ВВ-6, инвентарный номер 2052 | 720,00 | 72,00 |
| Лот 3 | Автомобиль «GAZ-3110», тип ТС – легковой специальный седан (SEDAN), номер кузова (vin) XTH31100031164782, цвет – серебристый металлик, год выпуска – 2003, регистрационный знак 5481 TAI, инвентарный номер 1305 | 660,00 | 66,00 |
| Лот 4 | Автомобиль «SKODA OCTAVIA A5», тип ТС – легковой седан (SEDAN), номер кузова (vin) TMBBK41Z282202054, цвет – серебристый металлик, год выпуска — 2008, регистрационный знак 3658 ВВ-6, инвентарный номер 859 | 4 260,00 | 426,00 |
| Лот 5 | Автомобиль «CHEVROLET NIVA 212300-55», тип ТС – легковой автомобиль внедорожник-универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) X9L212300C0414126, цвет – светло-серебристый металлик, год выпуска – 2012, регистрационный знак 9593 ЕВ-6, инвентарный номер 861 | 4 500,00 | 450,00 |
| Лот 7 | Автомобиль «CITROEN C5», тип ТС – легковой специальный хэтчбек, номер кузова (vin) VF7DCRHZB76067682, цвет – серебристый, год выпуска – 2001, регистрационный знак 9737 АТ-6, инвентарный номер 820 | 3 480,00 | 348,00 |
| Лот 9 | Автомобиль «GEELY EMGRAND X7», тип ТС – легковой специальный универсал (UNIVERSAL), номер кузова (vin) Y4K8762ZXFB009446, цвет – черный, год выпуска – 2015, регистрационный знак 0664 ЕТ-6, инвентарный номер 4251 | 11 810,51 | 1181,05 |
| Лот 10 | Автомобиль «GEELY EMGRAND X7», тип ТС – легковой внедорожник-универсал (SUV UNIVERSAL), номер кузова (vin) Y4K8762Z6FB009430, цвет – черный, год выпуска – 2015, регистрационный знак 9058 ЕС-6, инвентарный номер 632 | 7 259,08 | 725,91 |
| Лот 11 | Автомобиль «KIA SPORTAGE», тип ТС – легковой специальный внедорожник-универсал (suv universal), год выпуска – 1997, регистрационный знак – 0268 ЕТ-6, кузов (рама) № KNEJA5535V5416442, цвет ТС – темно-зеленый, инвентарный номер 14930 | 1 440,00 | 144,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **09 февраля 2023 года в 11.00** по адресу: г. Могилёв, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС.

Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **06.02.2023 г.**, время: **17.00.**
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и представления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
9. Извещение о проведении предыдущих аукционов по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 06.12.2022, на сайте ОАО «ДСТ № 3».

# НА ЛІНІІ АГНЮ

## У ЗША разгортваецца крывавая хваля ўзброенага гвалту

**Масавая стральба ў амерыканскім горадзе Мантэрэй-Парк штата Каліфорнія, у выніку якой 10 чалавек загінулі і яшчэ не менш чым 10 атрымалі раненні, стала рэкорднай па колькасці ахвяр пасля атакі на школу ў гарадку Ювальдзе штата Тэхас у маі 2022 года, сведчаць даныя некамерцыйнай арганізацыі Gun Violence Archive (GVA), якая займаецца зборам статыстыкі эпізодаў з ужываннем агнястрэльнай зброі. Віцэ-прэзідэнт ЗША Камала Харыс, у чым родным штаце і здарылася трагедыя ў Мантэрэй-Парку, вымавіла пафасныя словы аб неабходнасці пакласці канец гвалту. Вось толькі адразу пасля гэтай крывавай стральбы непадалёк зноў адкрылі агонь. 12 чалавек былі паранены.**

Пры гэтым з пачатку 2023 года ў GVA зафіксавалі ўжо больш чым 30 выпадкаў масавай стральбы ў ЗША, да якіх арганізацыя адносіць прымяненне гвалту з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі, у выніку якой чатыры і больш чалавек аказваюцца забітыя або атрымліваюць раненні.

Заснавальніца арганізацыі Moms Demand Action, якая выступае супраць гвалту з ужываннем агнястрэльнай зброі, Шэнан Уотс заявіла, што дадзены акт з'яўляецца чарговым сведчаннем таго, што ў Злучаных Штатах працягваецца «крызіс гвалту з ужываннем агнястрэльнай зброі». Яна таксама падкрэсліла, што кіраўніцтва ЗША павінна прыняць неабходныя меры, каб справіцца з гэтай «эпідэміяй».



Як заяўляе прэзідэнт ЗША Джо Байдэн, барацьба з «эпідэміяй узброенага гвалту» з'яўляецца дэклараваным прыярытэтам адміністрацыі, аднак значных зрухаў у гэтым працэсе, нягледзячы на намаганні, не адбываецца. У студзені мінулага года Белы дом аб'явіў, што ліцэнзію на зброю дадуць толькі тым, у каго ёсць месца для яе захоўвання, нагадала РІА «Навіны». Мінюст тады адзначыў, што, згодна з патрабаваннямі, парушэннем лічыцца прадстаўленне ілжывай інфармацыі пры куплі зброі, змоўчванне аб выяўленай скрадзенай або страчанай зброі, грэбаванне прадаўцом праверкай неабходных дакументаў і запісаў аб злачынствах перад перадачай зброі, продаж або перадача ў рукі асобе, якой забаронена, у тым ліку непрэзідэнту, а наяўнасць абаронянага месца захоўвання зброі павінна быць пацверджана федэральнай ліцэнзіяй. Пры гэтым у пачатку студзеня шасцігадовае дзіця ў штаце Віргінія страляла ў настаўніцу з пісталета сваёй маці.

У красавіку мінулага года Байдэн забараніў наборы для самастойнага збору зброі без серыйных нумароў. Да гэтага ў інтэрнэце можна было замовіць адпаведны камплект, з якога за паўгадзіны і без якой-небудзь падрыхтоўкі сабраць «пісталет-прывід».

Ізноў праблема ўзброенага гвалту апынулася ў фокусе ўвагі амерыканскіх улад пасля дзвюх трагедый у маі 2022 года — узброенага нападу на супермаркет у Бафала, дзе загінулі 10 чалавек, і масавага расстрэлу ў пачатковай школе Ювальдзе, дзе злачынца забіў 19 дзяцей і дзвюх настаўніц. У канцы чэрвеня Байдэн падпісаў закон, які ўзмацніў жорсткасць праверкі патэнцыйных пакупнікоў зброі ва ўзросце ад 18 гадоў да 21 года. Ён таксама заахвочвае штаты да прыняцця норм, што дазваляюць адмаўляць у валоданні пісталетамі і вінтоўкамі асобам, якіх суд прызнае небяспечнымі для грамадства, фінансуе праграмы школьнай бяспекі і псіхалагічнай дапамогі моладзі. Падобную норму прынялі ўпершыню за 30 гадоў, таму прэзідэнт ЗША і адміністрацыя называюць яе прарыўной.

Пры гэтым у кіраўніцтве Штатаў усведамляюць не толькі пагрозу для дзяцей — Байдэн казаў, што ад агнястрэльнай зброі іх гіне больш, чым паліцэйскіх і вайскоўцаў разам узятых, — але і празмернае распаўсюджванне зброі. Віцэ-прэзідэнт ЗША Камала Харыс прызнавала, што яго ў краіне больш, чым людзей. Статыстыка валодання зброяй за 2021 год дэманстравала, што ў ЗША на 100 чалавек яе даводзіцца 120,5 адзінкі. Пры гэтым Байдэн аднойчы паведаміў, што захоўвае дома чатыры драбавікі.

Аб маштабах трагедыі красамоўна сведчаць жудасныя лічбы. Паводле інфармацыі Gun Violence Archive, толькі за мінулы год у выніку інцыдэнтаў са стральбой у ЗША загінула больш за 43,6 тысячы чалавек, з іх больш за 1,6 тысячы дзяцей. Раненні атрымала больш як 37,9 тысячы чалавек, у тым ліку 4,4 тысячы дзяцей.

## Саудаўская Аравія мае намер стаць сёлета самай хуткарослай эканомікай у свеце

**Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Каралеўства Саудаўскай Аравіі (КСА) Файсал бен Фархан Аль Сауд заявіў на Сусветным эканамічным форуме (СЭФ) у Давосе, што яго краіна плануе абысці сёлета ўсіх у свеце па тэмпах росту эканомікі.**



Асноўным драйверам ажыццяўлення гэтага амбіцыйнага плана галоўны аравійскі дыпламат назваў не менш амбіцыйную праграму развіцця каралеўства пад назвай «Бачанне Саудаўскай Аравіі: 2030», распрацаваную ў 2016 годзе, паведаміў expert.ru. Гэта праграма дыверсіфікацыі саудаўскай эканомікі і паслаблення залежнасці каралеўства ад нафты. «Бачанне» прадугледжвае таксама развіццё ахвы здароўя, адукацыі, інфраструктуры, сферы адпачынку і турызму. Нядзіўна, што гэтую праграму часта называюць яшчэ і праграмай рэформаў, таму што яна прадугледжвае правядзенне глыбокіх пераўтварэнняў у многіх сферах жыцця КСА. У сваім выступленні кіраўнік МЗС КСА сярод іншага паведаміў аб зніжэнні ў каралеўстве беспрацоўя і адкрыцці рынку працы для прадстаўніц слабага полу, доля якіх павінна вырасці з цяперашніх 22 да 30 працэнтаў.

«Бацькам» «Бачання: 2030» з'яўляецца наследны прынц КСА Махамед бен Салман. Ён марыць аб ператварэнні Саудаўскай Аравіі ў сучасную краіну з аднаўляльнай энергетыкай. Самая амбіцыйная мэта — будаўніцтва Няома, першага на планеце «разумнага» горада, жыццё ў якім будзе цалкам аўтаматызаваным. Папярэдні кошт на будаўніцтва Няома ацэньваецца ў паўтрыльёна долараў.

Каралеўства актыўна супрацоўнічае з нашай краінай. Днямі па ініцыятыве саудаўскага боку адбылася тэлефонная размова міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргея Алейніка з міністрам замежных спраў Каралеўства Саудаўская Аравія прынцам Фейсалам бен Фарханам аль-Саўдам. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі. У ходзе тэлефоннай размовы былі абмеркаваны актуальныя пытанні палітычнага і гандлёва-эканамічнага парадку дня, а таксама практычныя крокі па развіцці беларуска-саудаўскага дыялогу на найбліжэйшую перспектыву. Кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў пацвердзілі зацікаўленасць у актывізацыі ўсебаковага беларуска-саудаўскага супрацоўніцтва і гатоўнасць да аказання ўзаемнай падтрымкі на міжнароднай арэне.

## Бразілія і Аргенціна створаць агульную валюту

**Аргенціна і Бразілія маюць намер перайсці на адзіную валюту, піша Financial Times. Яе прапануецца назваць sur (што перакладаецца з іспанскай як «поўдзень»), і яна можа стымуляваць рэгіянальны гандаль і знізіць залежнасць ад долара.**

Пра гэта заявілі прэзідэнты абедзвюх краін Лула да Сільва і Альберта Фернандэс у артыкуле на аргенцінскім партале Perfil. Па словах прэзідэнтаў, агульная амерыканская валюта дапаможа зменшыць выдаткі і знешнюю ўразлівасць. Лідары абмяркоўваюць тэму падчас візіту да Сільвы ў Аргенціну, які стане яго першай замежнай паездкай з моманту прыходу да ўлады.

Як вядома, цяпер у Аргенціне грашовай адзінкай з'яўляецца песа, а ў Бразіліі — рэал. Аргенцінскі міністр адзначыў, што іншыя краіны Лацінскай Амерыкі



змогуць далучыцца да праекта, калі ў іх узнікне жаданне. Да праекта адзінай валюты ў далейшым прапануюць далучыцца іншым краінам Лацінскай Амерыкі, і ў выпадку поспеху новы валютны блок можа стаць другім па велічыні ў свеце, піша Financial Times.

Краіны абмяркоўваюць стварэнне агульнай валюты ўжо некалькі гадоў, але перагаворы праваліваліся з-за супрацьдзеяння Цэнтрабанка Бразіліі, распявала адна з крыніц выдання. Цяпер, калі да ўлады ў абедзвюх краінах прыйшлі левыя лідары, у іх можа быць больш палітычнай падтрымкі.

Калі да праекта далучацца і іншыя краіны Лацінскай Амерыкі, на новы валютны саюз, паводле ацэнак FT, будзе прыпадаць каля 5 працэнтаў сусветнага ВУП. На найбуйнейшы ў свеце саюз — еўразону — прыпадае каля 14 працэнтаў сусветнага ВУП у доларавым выражэнні. Аднак Еўропе спатрэбілася 35 гадоў, каб стварыць яго, адзначыў у каментарыі выданню кіраўнік Мінэканомікі Аргенціны Серхіа Маса. «Я не хачу ствараць ілжывых чаканняў. Гэта першы крок на доўгім шляху, які трэба прайсці Лацінскай Амерыцы», — папярэдзіў ён. А міністр фінансаў Бразіліі Фернанду Адад удакладніў: гаворка не ідзе аб адмове ад песа і рэала, а аб «агульнай віртуальнай валюце для ўмацавання гандлю».

## Прэм'ера Вялікабрытаніі аштрафавалі за непрышпілены рэмень бяспекі

**Паліцыя графства Ланкашыр на паўночным захадзе Англіі заявіла, што выпісала штраф «42-гадоваму мужчыну з Лондана», паведаміла «Бі-бі-сі». Штраф за непрышпілены рэмень бяспекі ў аўтамабілі, які рухаецца, — 100 фунтаў, ён можа ўзрасці да 500 фунтаў у выпадку, калі парушальнік звернецца ў суд, але будзе прызнаны вінаватым.**



У заяве Даўнінг-стрыт гаворыцца, што Рышы Сунак «цалкам прызнае сваю памылку і прыносіць прабачэнні» і заплаціць штраф. Прэм'ер-міністр, як сцвярджаецца, адшпіліў рэмень бяспекі на час здымак промароліка ў графстве Ланкашыр аб праграме брытанскага ўрада па развіцці рэгіёнаў.

Гэта другі штраф Сунака за час яго работы ва ўрадзе. У красавіку мінулага года ён быў аштрафаваны разам з Борысам Джонсанам і яго жонкай Кэры за парушэнне каранцінных правілаў, уведзеных на час пандэміі. Гаворка ідзе пра адну з вечарынак на Даўнінг-стрыт падчас лакдаўну: Сунак удзельнічаў у святкаванні дня нараджэння тагачаснага прэм'ер-міністра ў чэрвені 2020 года.

У партыі ліберал-дэмакратаў ужо заявілі, што, стаўшы другім прэм'ерам у гісторыі, аштрафаваным паліцыяй, Сунак «прадэманстраваў такую ж непавагу да правілаў, як і Борыс Джонсан». «Яны паводзяць сябе так, быццам для іх закон адзін, а для астатніх іншы, але гэты штраф — знак таго, што кансерватары ў выніку панясуць заслужанае пакаранне», — сказала лідар партыі Дэйзі Купер. У партыі лейбарыстаў заявілі, што скандал са здымкам ператварыў прэм'ер-міністра ў «пасмешышча».

## У Нідэрландах распачаўся сезон цюльпанаў

**Нацыянальны дзень цюльпанаў адсвяткавалі ў Амстэрдаме. Гэта афіцыйны пачатак сезона цюльпанаў, які працягнецца з канца студзеня да канца красавіка, паведаміў Euronews.**

З нагоды свята на Музеумплейн — плошчы Музеяў — раскінуўся маляўнічы сад з 200 тысяч кветак усіх сартоў і адценняў. Вытворцы аднавілі таксама дэталь карціны Яна Вермеера «Спадарыня і служанка».



З 2013 года ў Нідэрландах адзначаюць нацыянальны дзень цюльпанаў, калі жывыя кветкі раздаюць усім ахвотным. Звычайна свята праходзіць на плошчы Дам, але гэтым разам яно перамясцілася на Музейную плошчу.

На «цюльпаманію» Галандыя захварэла ў XVII стагоддзі. Кветка фактычна стала сімвалам краіны.

Матэрыялы падрыхтаваў Захар БУРАК.



Памяць

# Герою было толькі дваццаць... І яшчэ адзін

**Сёлета 18 лютага 100 гадоў з дня нараджэння ўдзельніка вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Героя Савецкага Саюза Б. С. Акрэсціна.**

Барыс Сямёнавіч — масквіч, з сям'і чыгуначнікаў. Пасля сямігодкі займаўся ў аэраклубе — асвойваў лётную справу.

З верасня 1942-га ён ваяваў на Сталінградскім, потым на чацвёртым Украінскім фронце, у складзе экіпажа начных бамбавікоў здзейсніў сотні баявых вылетаў і атрымаў свае першыя ўзнагароды. На адрас яго бацькоў камандаваннем часці быў накіраваны ліст са словамі падзякі за выхаванне сапраўднага патрыёта, які ў барацьбе з ворагам не ведае страху. Гвардыі старшаму лейтэнанту Акрэсціну было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго, маладога лётчыка, у армейскай і дывізіённай газетах, баявых лістках называлі майстрам штурмавых удараў, паветраным снайперам.

З пачаткам стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён» авіяполк, дзе ваяваў Барыс Акрэсцін, увайшоў у склад першай паветранай арміі трэцяга Беларускага фронту. Ад яго камандавання паступіў загад не даць вывезці ў Германію баявую тэхніку і нарабаваную маёмасць (вялікую колькасць



варожых эшалонаў разведка выявіла на ўчастку Орша — Талачын). Барыс Акрэсцін узначаліў групу штурмавікоў, якая змагла цалкам паралізаваць чыгуначны рух...

На пачатку ліпеня 1944-га перад эскадрыллю праслаўленага лётчыка была пастаўлена задача падтрымліваць наземныя часці, якія знішчалі фашыстаў у «Мінскім катле». Барыс Акрэсцін некалькі разоў вадзіў сваю групу на скопішчы танкаў, аўтамашын і пяхоты ворага. Падчас чарговай штурмоўкі яго самалёт быў падбіты: ахопленую агнём баявую машыну лётчык накіраваў на варожую калону — знішчыўшы пры гэтым шмат гітлераўцаў і тэхнікі.

Пасмяротна Барыс Акрэсцін быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені. Імем героя названыя адна з вуліц Ліды, вуліца, завулак і гімназія № 30 у Мінску. Там жа, у сталіцы, на Вайсковых могілках, усталяваны помнік. Герою было толькі дваццаць... І яшчэ адзін.

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*

Дзейныя асобы

# «ВУЧЫЦЦА Ў ІНШЫХ
## і для іх жа быць прыкладам»

*...На вуліцы яшчэ толкам не развіднела, а да акенца рэгістратуры ўжо сышоўся народ.*

*— Мне, калі ласка, талончык да Гарбацэвіч.*

*— На сёння да яе талонаў няма. Да іншага тэрапеўта браць будзеце?*

*— Не... З маім букетам хвароб — толькі да Ірэны Віталеўны...*

Падобныя дыялогі, відаць, — самае яскравае сведчанне прафесіяналізму ды найлепшых чалавечых якасцяў і ўрачоў наогул, і выдатніцы аховы здароўя Ірэны Віталеўны Гарбацэвіч у прыватнасці.

Каля 30 гадоў яна адпрацавала загадчыцай тэрапеўтычнага аддзялення Бярэзінскай раённай бальніцы, а ўжо колькім хворым змагла дапамагчы, — не паддаецца ніякім падлікам!

Поплеч з Ірэнай Віталеўнай працуе і яе муж Анатоль Пятровіч. Ён таксама вельмі вопытны спецыяліст, выдатнік аховы здароўя, загадчык аддзялення рэанімацыі... У гэтай сям'і, можна сказаць, жыццёвае крэда — вучыцца ў іншых і для іх жа быць прыкладам.

...У нашым раёне апошнім часам распачалі сваю працоўную дзейнасць 18 маладых медыцынскіх работнікаў (у тым ліку — 8 урачоў). Хочацца верыць, што веды, атрыманыя падчас вучобы, яны змогуць падмацаваць практыкай і да хворых будуць ставіцца гэтак жа ўважліва ды адказна, як сужэнцы Гарбацэвічы, як намеснік галоўнага ўрача бальніцы Валянціна Валер'еўна Лушчык, неўролаг Ганна Альфонсаўна Шыцік, загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення Анастасія Андрэеўна Кірэева і многія іншыя.

...Медыцыну Гіпакрат лічыў самым высакародным з усіх мастацтваў. Вось і хочацца, каб служылі яму людзі сапраўды высакародныя.

**Ніна Бурко,**
*г. Беразіно.*

# Была б любімая справа,
## а час заўсёды знойдзецца

**На Маларытчыне ёсць некалькі населеных пунктаў, якія можна назваць цэнтрамі дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Адзін з іх знаходзіцца ў аграгарадку Олтуш, дзе жыве і працуе Ніна Мікітчук. Шыццё і вышыванне, вязанне, бісерапляценне, лепка з гліны... У гэтым усім яна — сапраўдны майстар, які цяпер спрабуе сілы ў дызайне адзення, у распрацоўцы інтэр'ераў.**



— Творчая жылка ў мяне праяўлялася з дзяцінства. Увесь час, колькі помню сябе, спрабавала нешта стварыць, — усміхаецца майстрыха. — Не раз калола пальцы іголкамі, пруткамі, але справу не кідала. Шыць, вязаць, вышываць вучылася ў бабулі і мамы Ганны Якаўлеўны. Ад іх жа — маё жаданне пачынаць з нуля і кожную справу даводзіць да канца. Не важна, колькі на гэта спатрэбіцца часу. Для мяне галоўнае — вынік. Бывае, што не адразу нешта атрымліваецца, але ж рукі не апускаю: шукаю выйсце, эксперыментую. Бабуля ўвесь час казала, што нельга спыняцца на паўдарозе.

Ніна Мікітчук нарадзілася і вырасла ў маляўнічай вёсцы Буцынь, што на Валыншчыне. Бацька яе ўсё жыццё працаваў шафёрам у мясцовым калгасе, маці — настаўніцай пачатковых класаў.

— У нас дома была багатая бібліятэка, — успамінае Ніна Пятроўна. — Спачатку я разглядала кнігі з малюнкамі. А калі навучылася чытаць, найбольш цікавіла літаратура і часопісы па рукадзеллі. Мне многаму хацелася навучыцца: я спрабавала, а чаго не магла зразумець, — ішла да мамы. Яна тады адкладвала ў бок праверку сшыткаў і паказвала, як зрабіць тое ці іншае, перадавала вопыт...

Пасля заканчэння сярэдняй школы Ніна Мікітчук паступіла ў Луцкі кааператыўны тэхнікум, атрымала дыплом, аднак папрацаваць па спецыяльнасці дзяўчыне не ўдалося: выйшла замуж, пераехала ў Шацк.

— Для нашай сям'і гэта быў няпросты перыяд, — гаворыць Ніна Пятроўна. — Перажывалі і беспрацоўе, і безграшоўе, думалі пра пераезд. Знаёмыя мужа настойліва раілі Маларыцкі раён. Пра тое ж гаварыла мая сястра Вольга, якая пасля ўніверсітэта працавала на адным з прадпрыемстваў Брэста... І ўсё роўна сарвацца з месца было вельмі складана! Але ж мы ўрэшце адважыліся: у Олтушы нам адразу выдзелілі жыллё. Пасля дэкрэтнага водпуску я нейкі час працавала ў дзіцячым садку, сакратаром у школе.

...Тагачасны дырэктар Наталля Зезюкова, даведаўшыся пра здольнасці маладой жанчыны, прапанавала ёй весці гурткі «Чароўная гліна», «Крэатыўнае рукадзелле», і...

З тканіны, кардону, паперы дзеці пад яе кіраўніцтвам сталі ствараць прыгажосць: са старых газет, быццам з лазы, плесці кошыкі, са звычайных нітак — рабіць вазы...

Тым часам у Доме рамёстваў адкрылася вакансія загадчыка, Ніне Пятроўне зрабілі адпаведную прапанову.

Яна не адразу згадзілася, узважвала «за» і «супраць», прыкідвала, што зможа зрабіць.

— Новая пасада як быццам акрыліла мяне, дала штуршок для далейшай творчасці. Захацелася многае паспрабаваць, дапамагчы мясцовым майстрыхам рэалізаваць іх творчыя планы.

На занятках у шасці аматарскіх аб'яднаннях, якія дзейнічаюць у Доме рамёстваў, ёсць магчымасць з карысцю правесці вольны час, нечаму навучыцца. Усё больш папулярнымі становяцца рэчы, зробленыя сваімі рукамі: беларуская вышыўка, пацеркі, тэкстыльныя вырабы, штучныя кветкі...

Зроблена многае, аднак спыняцца на дасягнутым Ніна Мікітчук не збіраецца:

— Цяпер выношваю ідэю стварэння ўласнай творчай майстэрні, — кажа майстрыха. — Я не раз задавалася пытаннем: «Чаму так мала людзей займаецца дэкаратыўна-прыкладной творчасцю? Гэта ж такое шчасце!..» І сама сабе адказвала: «Для дзяцей ёсць розныя секцыі, гурткі, аб'яднанні па інтарэсах... А куды пайсці даросламу чалавеку, дзе яму навучыцца нечаму новаму, атрымаць задавальненне ад творчасці?» Вось такіх людзей мне і хацелася б запрасіць на майстар-класы.

***— Як да гэтай ідэі ставіцца муж?***

— Ён рады за мяне: амаль з кожнай паездкі прывозіць нейкі матэрыял для творчасці. Падтрымліваюць і дачушкі. Дарэчы, малодшая, Ірына, закончыла выяўленчае аддзяленне Маларыцкай дзіцячай школы мастацтваў. Цяпер яна — студэнтка будаўнічага факультэта Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта. Будзе архітэктарам-дызайнерам.

***— Вы ж таксама малюеце?***

— Так, гэтае захапленне ў мяне з дзяцінства. Цяпер перавагу аддаю нацюрмортам і птушкам.

...У Ніны Пятроўны Мікітчук, чым бы яна ні займалася, усё атрымліваецца прыгожа! Аднак гэта, ну вядома ж, не з наскоку: патрэбны ўседлівасць, карпатлівая і напружаная работа.

А што да часу, то ён, як лічыць майстрыха, на любімую справу заўсёды знойдзецца. Была б толькі такая справа.

**Мікалай Навумчык,**
**фота аўтара.**
*г. Маларыта.*

Свой погляд

# «КАБ МЕЦЬ, ТРЭБА ЎМЕЦЬ»,
## альбо Пачынаецца ўсё з сям'і

**Мой сусед, ветэран працы Мар'ян Адольфавіч Рудэўскі, мусіць, праўду кажа, што цяпер шмат хто з маладых, як тое сіратлівае дрэва ў полі, хіліцца то туды, то сюды: не мае стрыжня і мэты, не разумее, чаго яму хочацца, баіцца работы і адказнасці. Адкуль гэта ў іх? Ды відавочна: усё пачынаецца з сям'і.**

**У кожнага яна, вядома ж, свая, але пры гэтым здольная, падобна вытоку, альбо сілкаваць праз усё жыццё, альбо...**

Я, напрыклад, да сёння з вялікай павагай і любоўю ўспамінаю сваіх бацькоў, думаю, наколькі ж мудра нас, чацвярых, яны выхоўвалі!

Малым я заўсёды стараўся сустрэць тату з работы, разам з ім распрэгчы і пакарміць каня, па суботах — памыцца ў лазні. А якое шчасце было пасля яе легчы ці сесці побач і заспяваць!

Не дзіва, што яшчэ да школы ведаў безліч прыгожых песень, што яны, татавы, дапамагалі потым адольваць ці не ўсе мае жыццёвыя цяжкасці.

А вось хадзіць у школу мне зусім не хацелася: тыдні два павучыўся і кінуў. Думаеце, тата ўзяўся за дзяжку? Не.

Мама таксама не крычала і не сварылася, сказала толькі: «Ну што ж, сынок, сядзі сабе дома. Не будзеш вучыцца — будзеш каровам хвасты круціць».

Мяне гэта перспектыва прывабіць ну ніяк не магла, і я вярнуўся за парту. Тата, каб падтрымаць, па вечарах запальваў лямпу-газніцу, вучыў са мною літары. І не марна: лёд, што называецца, крануўся: праз нейкі час, хай па складах, але я ўголас прачытаў сваю першую казачку! Мама ўзрадавалася гэтаму больш за ўсіх, бо ні чытаць, ні пісаць зусім не ўмела.

Не ўхіляліся мы, малыя, і ад хатніх спраў: дапамагалі бацькам даглядаць гаспадарку, палоць грады і калгасныя дзялкі, жаць збажыну... Мне гадоў мо 12 было, калі ўпершыню выйшаў на пакос, калі ўзяў у рукі сваю першую коску-шасцёрку, калі тата паказаў, як трэба трымаць яе, як прыціскаць «пяткай» да зямлі...

Я, помню, вельмі стараўся, хоць з непрывычкі «гарэлі» далоні, балела правае плячо, але ж пасмы добрай травы ў мяне ўсё роўна заставаліся. «Так не пойдзе, — казаў мне тата. — Глядзі, як трэба. У цябе атрымаецца!» З гэтымі словамі, павастрыўшы маю касу, ён пачынаў свой урок спачатку.

...Вось так да нас даводзілі ці не галоўнае правіла: каб нешта мець, трэба ўмець, не баяцца працы і цяжкасцяў, верыць ва ўласныя сілы, цаніць дабро, атрыманае ад іншых і зробленае самімі.

Па вялікіх святах мы ўсёй сям'ёй адпраўляліся ў госці да бабулі. Яна частавала нас духмянай травяной гарбатай, пірагамі з ячнай мукі грубага памолу (пасля вайны за шчасце была хоць такая) і цукеркамі-падушачкамі, смак якіх помніцца да сёння...

Як і першы ўрок міласэрнасці. Аднойчы на кірмашы ў Смаргоні мы ўбачылі безногага салдата з шапкай на зямлі. Мама адразу ж спынілася, паклала мне ў далоньку нейкія манеты і сказала: «Падыдзі, сынок... Падай».

Я нясмела наблізіўся, паклаў капейкі ў шапку... І як жа добра ў мяне стала на душы! Якое шчасце было пачуць салдатава «дзякуй»!

...Нехта можа сказаць, што гэта ўсё — сум па бацьках, па маленстве. Здаецца, не? А калі і сум, дык па тых, па ранейшых устоях і традыцыях.

Сённяшнія мамы, наколькі ведаю, стараюцца не карміць немаўлят грудным малаком. Сённяшнія таты амаль не спяваюць з імі песень і не чытаюць казак: пасадзяць каля экрана, і хай малое глядзіць, што хоча.

А ўсё таму, што, на мой погляд, цяперашнім бацькам ніхто не давёў, што дрэннае дзеці засвойваюць куды хутчэй, чым харошае.

**Мікалай Балыш,**
*г. Ашмяны.*

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ПО ПРОДАЖЕ КАПИТАЛЬНОГО СТРОЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк»

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта продажи** | **Изолированное помещение с инвентарным номером 630/D-28198, расположенное по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 121-105, общей площадью 96,0 кв. м** |
| **Начальная цена продажи** | 123364,08 бел. руб. (сто двадцать три тысячи триста шестьдесят четыре рубля 08 копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 12336,41 бел. руб. |
| **Дата проведения аукциона** | **24.02.2022 в 11.00** |
| **Сроки и место подачи документов на участие** | До 15.00 20.02.2022 по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1-4, каб. 108 |
| **Продавец** | ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе государственной регистрации по местонахождению объекта |
| **Контактные данные** | По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: 8 (017) 2214030, 8 (029) 198-19-17 |
| **Дополнительное условие** | Покупатель возмещает расходы по проведению рыночной оценки в размере 454,67 бел. рубля с учетом НДС |

*Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.*

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

